Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гада.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц . . . . — 70 к. „ 3 „ . . . . 2 р. — к. „ 6 „ . . . . 4 р. — к. „ 1 год . . . . 7 р. — к. Замена адрасу: іншагародняя—30 к., жнецкая . . . . —10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нанпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нанпарэлі наперад тэксту 1 р. — к. За радок нанпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьменныя на 50 проц. дарожай. Зьніж тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт . . . 35 кап. За кожны дадатковы . 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт . . 15 „ За кожны дадатковы . . 5 „ Публікацыі ЗАГСа—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

8-мы ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 255 (2147) Пятніца, 11-га лістапада 1927 г.

АДЧЫНЕНЬНЕ МЕНСКАЙ АКРУГОВАЙ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ.

6-я Менская акруговая канфэрэнцыя КП(б)Б АДЧЫНЯЕЦЦА **16-га лістапада ў 11 гадзін раніцы у клюбе імя Карла Маркса** (уваход з вуліцы Карла Маркса).

Выдача мандатаў дэлегатам, абраным на акруговую партканфэрэнцыю, праводзіцца ў акругкоме КП(б)Б (2 паверх, пак. № 9) 12, 13, 14 і 15 лістапада з 9 гадзін раніцы да 3 гадзін дню, а 16 лістапада—з 9 гадзін раніцы да адчыненьня канфэрэнцыі.

Акругком КП(б)Б.

Адна з асноў індустрыялізацыі.

Індустрыялізацыя СССР робіць буйныя посьпехі. Будуюцца новыя заводы, пераабсталёўваюцца ўжо існуючыя. Усюды кіпіць праца на зьнішчэньню недахопаў, палепшаньню тэхнікі і арганізацыі вытворчасьці. Зьнішчаюцца старыя парадкі, ствараюцца новыя арганізацыйныя формы, выкарыстоўваюцца дасягненьні сучаснай тэхнікі для большага посьпеху сацыялістычнага будаўніцтва.

Новая тэхніка—база індустрыялізацыі Саюзу—вельмі адрозьніваецца ад таго, што мы мелі да гэтай пары. Кожны завод, які рэарганізуецца ці наново будуецца, маючы сваю выразную праграму—масавыя поўныя вырабы, мае магчымасьці спэцыялізавацца і ўжыць усе стараньні да таго, каб выпушчаемыя ім вырабы былі лепшай якасьці і каштавалі дзяржаве магчыма таньней. Новая арганізацыя—арганізацыя сацыялістычнай народнай гаспадаркі—вымагае дапасаванай чыннасьці паасобных яго частак. Завод зьяўляецца асобнай маленькай часткай вялізарнага калектыўнага мэханізму. Ён павінен атрымліваць ад іншых заводаў сыравіну і матар'ялы патрэбнай якасьці і ў належныя тэрміны, а таксама завод сам павінен з гонарам выконваць свае абавязкі, своячасова дастаўляючы іншым заводам добраякасныя вырабы.

Стары гандлярскі лёзунг: «Не ашукаеш—не прадасі» трэба здаць у архіў і замест яго ўзяць наш лёзунг, адпаведны мэтам і задачам сацыялістычнага будаўніцтва: «Лепшае задаволеньне патрэб працоўных». Спажывец павінен атрымліваць вырабы, якія-б яго ў поўнай меры задавольнілі. Ашуканьне спажыўца ў савецкіх умовах азначае зьнижэньне рэальнай заработнай платы. Дабраякасныя таньныя вырабы спрыяюць узьняцьцю жыцьцёвага ўзроўню працоўных.

Масавыя спажыўцы Саюзу—рабочыя і сяляне—патрабуючы поўныя тавары, гэтым самым ствараюць неабходныя ўмовы для здаровага разьвіцьця прамысловасьці на аснове масавай вытворчасьці.

Увесь гэты працэс праходзіць пад сьцягам спэцыялізацыі і стандартызацыі.

Вялікая праца праводзіцца рознымі арганізацыямі вытворчымі, гандлёвымі, каапэрацыйнымі і інш. па вызначэньню стандартаў, г. зн. вызначэньню ўсіх тых разьмераў і ўласьцівасьцяй, якія павінны мець і якімі павінны ўладаць рэчы шырокага ўжываньня: тканіны, жалеза, мука, цэгла і інш. Пасьля шматлікіх пагоджаньняў з зацікаўленымі ўстановамі выпрацоўваюцца стандарты, тэхнічныя ўмовы, вурочныя налажэньні і інш. З другога боку, заводы робяць ачыстку ад пакінутага ў спадчыну сьмецьця і спэцыялізуюцца, зьмяншаючы свой каталёг і паступова пераходзяць да стандартных вырабаў.

Новыя заводы будуюцца адпаведна патрабаваньняў сучаснай тэхнікі: заводы вялікагрузных вагонаў, на вырабу плугоў, трактараў і інш., маючы сваёй праграмай толькі адзін тып машын, тып стандартны, прызнаны лепшым у нашых сучасных савецкіх умовах. Заводы, ставячы перад сабой задачу—масавых стандартных вырабаў, маюць магчымасьць разьбіць усю працу на пэраг паступовых апэрацый і для кожнай апэрацыі мець спэцыяльныя машыны і рабочых адпаведнай кваліфікацыі. Увесь вытворчы працэс набывае зусім выразны напрамак, і кожная яго стадыя адбываецца згодна патрабаваньняў тэхнікі.

Матар'яльныя выгады прамысловасьці ад праваднімай спэцыялізацыі і стандартызацыі, могуць быць выяўлены толькі пасьля ўкладаньня патрэбных сродкаў для пераабсталяваньня і праз пэўны час для таго, каб былі відаць вынікі.

Ня гледзячы на тое, што гэтая праца ў нас пачалася нядаўна (каля 2-х гадоў), мы ўжо маем некалькі сотняў стандартаў жалеза, цэглы для будынкаў, тканіны і інш.

На некаторых заводах мы ўжо маем значнае павышэньне прадукцыйнасьці і сталае зьнижэньне сабекошту.

Задачы стандартызацыі і спэцыялізацыі, як аснова індустрыялізацыі, павінны быць зразумелы ўсімі працоўнымі, якія і забясьпечаць посьпех іх ажыцьцяўленьне.

Рабочая дэлегацыя СССР пакідае Бэрлін.

БЭРЛІН, 9-XI. З Бэрліну дэлегацыя рабочых СССР павінна выехаць назад увечары 10-га лістапада, бо ўлада, з ведама міністра ўнутраных спраў, сацыял-дэмакрата Грэзінскага, адмовілася прадоўжыць тэрмін візы, які мае мод на 5 дзён.

У зьвязку з гэтым «Ротэ Фанэ», падкрэсьліваючы, што чужаземныя спэкулянты атрымліваюць дазвол быць у Нямеччыне досыць доўгі час, прапануе бэрлінскаму пралетарыяту **праводзіць дэлегатаў рабочых СССР магутнай дэманстрацыяй**, каб паказаць, што **працоўныя Нямеччыны бачаць у іх прадстаўнікоў першае пралетарскае дзяржавы**, якая зьяўляецца бацькаўшчынаю і для нямецкага пралетарыяту.

Франка-югаслаўскі гарантыйны ўгавор.

ВЕНА, 8-11. Водлуг паведамленьняў з Белграду, гэтымі днямі павінен быць падпісаны франка-югаслаўскі ўгавор аб прыязьні і арбітражы. Для падпісаньня ўгавору югаслаўскі міністр замежных спраў Марынковіч выехаў у Парыж.

Газэта «Время» зазначае, што спачатку меркавалася ўтварыць угавор трох дзяржаў—франка-італа-югаслаўскі, але спробы прыцягнуць Італію ня мелі посьпеху.

Орган міністра замежных спраў Марынковіча «Правда» кажа, што ўгавор «не спаткае аднадушнае ўхвалы эўрапейскіх дзяржаў і выкліча нападкі аднае дзяржавы» (водлуг агульнае думкі палітычных колаў, газэта мае на ўвазе Італію). Італьлянскі пасланьнік Бардэро выехаў у Рым па вызаве Мусаліні. Саўгарскі пасланьнік таксама выкліканы сваім урадам для дакладу аб франка-югаслаўскім угаворы.

Гвалт над калёрадзкімі гарнякамі.

НЬЮ-ЁРК, 8-XI. Улада штату Калёрада адкрыта спрабуе прыдушыць забастоўку гарнякоў гвалтам. Учора арыштавана 30 лідэраў забастоўкі, у тым ліку найбольш актыўныя працаўнікі «індустрыяльных рабочых сьвету», якія знаходзяцца ў адзіночным зьняволеньні. Вайдэнбурскі астрог у Калёрада, дзе зьняволены лідэры забастоўкі, ахоўваецца ўзмоцненымі атрадамі з кулямётамі. Бастуючыя вартуюць шлях з астрогу, каб перашкодзіць высылцы лідэраў з Калёрада. Бастуючыя акругі перапоўнены паліцыяй, войскам і ўзброенымі сіламі прыватных арганізацый. Вайсковыя самалёты без перапынку кружаць над капальнямі. Становішча робіцца ўсё больш абвостраным.

Водлуг вестак забастовачнага камітэту, у забастоўцы ўдзельнічае 10 тысяч чалавек.

Пасыўны балянс Англіі ў гандлі з СССР.

ЛЁНДАН, 8-XI. 8-га лістапада адпавілася дзейнасьць парляманту.

Адказваючы на запытаньні, міністр гандлю Лістэр заявіў, што за тры месяцы, канчаючы 30 верасьня, імпорт у Англію з СССР склаў 7.600 тысяч фунтаў стэрлінгаў, у параўнаньні з 6.400 тысяч фунтаў за адпаведны квартал леташняга году. Экспорт Англіі ў СССР у той-жа час склаў 1.022 тысяч фунтаў стэрлінгаў у параўнаньні з 1.200 тысячамі за адпаведны пэрыяд леташняга году.

Дэпутат рабочае партыі Кэнворці запытаў, ці не парушаецца гэтым гандлёвы балянс Англіі.

Лістэр адказаў, што, не зважаючы на значныя налёгкі, прапанаваныя СССР, апошні адмовіўся рабіць у Англіі заказы. Кэнворці запытаў, ці-ж сучасны ўрад не рабіў усё магчымае, каб перашкодзіць англа-расейскаму гандлю. На гэтае запытаньне Кэнворці адказу не атрымаў.

Арышты ў Літве.

Апошнімі днямі літоўская адміністрацыя зрабіла у цэлай Літве шэраг рэвізій сярод асоб, западозраных у камунізьме. Рэвізіі зроблены у Лейпунах, Рушах, Аліце, Сумелішках, Шырвінтах, Шосьлях, Бурштанах, Бутрымаицах і Малятох.

Арыштавана каля 50 асоб.

Зьезду фашысцкае Лігі.

ПАРЫЖ, 9-11. У Брусэлі адчыніўся зьезд міжнароднае асацыяцыі барацьбы з камунізмам (Ліга Обэра). Спрачкі адбываюцца пры зачыненых дзьвярох. Прадстаўнікі друку на зьезд не дапушчаны.

Антысавецкі мяцеж белагвардзейцаў у Кітаі.

ШАНХАЙСКАЕ КОНСУЛЬСТВА ПАД ПАГРОЗАЮ АДНАЎЛЕНЬНЯ НАСКОКУ.

НАПАДЫ НА АСОБНЫХ ГРАМАДЗЯН СССР. КІТАЙСКАЯ ЎЛАДА БЯЗЬДЗЕЙНІЧАЕ.

НАПАД НА СЭКРАТАРА ПЕКІНСКАГА КОНСУЛЬСТВА.

ПЕКІН, 9-XI. Консул Калесьнікаў паведамляе, што 8-га лістапада на сэкратара консульства СССР у Дайрэне Чаркасава наскочылі на вуліцы белагвардзейцы. Чаркасаў атрымаў 17 цяжкіх ран сьцізоркам. Паранены перавезен у больніцу.

Праца консульства спынена.

ШАНХАЙ, 9-XI. Праца гандлёвага прадстаўніцтва і аддзяленьня савецкага гандлёвага флёту, якія зьмяшчаюцца ў памяшканьні консульства СССР у Шанхаі, спынена ў зьвязку з наскокам на консульства.

Супрацоўнікі гандлёвага прадстаўніцтва і савецкага гандлёвага флёту бяруць удзел у самаабароне.

Дзікае збойства 2-х савецкіх маракоў.

ШАНХАЙ, 9-XI. Консул СССР у Шанхаі атрымаў ад капітана савецкага параходу „Індыгірка" рапарт з паведамленьнем пра варунки збойства другога памоцніка капітана Лісенкі і матроса-прыбіральшчыка. Лісенка 7-га лістапада накіраў усіх да консульства СССР, але ля памяшканьня быў абкружаны натоўпам белагвардзейцаў, якія павалілі Лісенку і сурова зьбілі яго, прычым прабілі яму чэрап.

Пасьля перавязкі ў шпіталі Лісенку груба дапытваў паліцэйскі (расейскі белагвардзеец). Пасьля допыту паліцэйскі прывёў Лісенку да памяшканьня консульства, дзе натоўп белагвардзейцаў паўторна зьбіў пацярпеўшага. Калі Лісенка зваліўся на зямлю, дык белагвардзейцы тапталі яго ботамі. Зьбіты Лісенка ледзь дабраўся да параходу.

У зьвязку з пагрозамі белагвардзейцаў учыніць наскок на „Індыгірку", капітан адвёў параход ад прыстані. Каманда параходу праз усю ноч стаяла на варце, рыхтуючыся адбіць наскок.

8-га лістапада расейскія белагвардзейцы зьявіліся ля параходу з выгукамі „разьбілі консульства—зруйнуем і вас".

Консул СССР пераслаў рапарт капітана „Індыгірні» з адпаведнаю нотаю да камісара па замежных справах у Шанхаі.

Бясчынствы ня суніманюцца.

ШАНХАЙ. Ёсьць весткі, што два нападаючыя белагвардзейцы паранены і знаходзяцца ў вельмі цяжкім становішчы. Непакоюцца, што сьмерць іх можа выклікаць новыя спробы разгрому консульства.

Белагвардзейскія газэты заклікаюць да новых бандыцкіх выступленьняў. Высьвятляецца, што дзьве грамадзянкі, якія хацелі ўвайсьці ў паўнамоцнае прадстаўніцтва, былі страшна зьбіты белымі бандытамі. Цяжка зьбіты на вуліцы матрос савецкага параходу, які знаходзіцца ў шанхайскім порце.

8-га белыя бандыты зьбіраліся каля прыстані, мабыць з мэтаю нападу на параход. Кітайская ўлада наведала кітайскую рачную паліцыю і папярэдзіла салдат аб нападзе.

Высьвятляецца, што калі некаторыя жанчыны выяжджалі з консульства дадому, дык за іх аўтамабілямі ехалі аўтамабілі перапоўненыя белагвардзейцамі, якія, як відаць, высьлежвалі іх кватэры.

10-ТЫ КАСТРЫЧНІК ЗАГРАНІЦАЮ.

7-га лістапада ў Польшчы.

ВАРШАВА. 9-XI. Гарадзкая рада Чэнстахову (Дамброўскі район), большасьць у якой належыць блёку рабочага адзінства, пастанавіла зьвярнуцца да савецкага ўраду з прывітаньнем у зьвязку з 10-цігодзьдзем Кастрычнікавае рэвалюцыі. Адначасна гарадзкая рада пастанавіла паслаць у СССР за кошт гораду дэлегацыю для азнаямленьня з пастаноўкаю камунальнае гаспадаркі ў СССР.

У Вільні адбылася дэманстрацыя ў гонар 10-цігодзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі. Паліцыя разагнала дэманстрантаў.

У розных гарадох і пасёлках Віленшчыны ў дзень Кастрычнікавае гадавіны зьявіліся чырвоныя сьцягі з надпісамі ў гонар Кастрычніка.

У Пазнані на фабрыках і заводах распаўсюджваліся лістоўкі і адозвы.

Водлуг вестак, у часе кастрычнікавае дэманстрацыі ў Варшаве было паранена 22 рабочыя-дэманстранты.

10-ты Кастрычнік у Аўстрыі.

ВЕНА, 7-XI. Не зважаючы на забарону паліцыі, у Вене адбылася, наладжаная аўстрыйскай кампартыяй дэманстрацыя, у якой узялі ўдзел тысячы рабочых. Выступалі прадстаўнік ЦК аўстрыйскае кампартыі Рыс, прадстаўнік саюзу моладзі Ляўшэр і дэпутат рэйхстагу камуніст Гекэрт.

Сход адназгодна пастанавіў паслаць прывітальную тэлеграму ЦК УсеКП(б) і ЦВК СССР. У тэлеграме да ЦК УсеКП(б) гаворыцца: «Клянёмся зрабіць усё з нашага боку, каб вырваць рабочых з-пад здрадніцкага кіраўніцтва сацыял-дэмакратаў, згодна ленінскіх заветаў і аб'яднаць рабочых пад камуністычным сьцягам.

Да ЦВК СССР гаворыцца: клянёмся ў выпадку вайны ахвяраваць саветам усё нашае жыцьцё і сілы, каб адказам на імпэрыялістычную вайну было скасаваньне капіталізму.

Шматлюдныя дэманстрацыі ў Швэйцарыі.

БЭРЛІН, 9-XI. Водлуг надасланых паведамленьняў, кастрычнікавыя ўрачыстасьці ў Швэйцарыі мелі магутны характар. У Базэлі ў іх удзельнічала 4 тысячы чалавек, у тым ліку група сяброў чырвонага саюзу нямецкіх франтавікоў. У Цурыху лік удзельнікаў дасягаў 2-х тысяч чалавек.

Сход, скліканы сацыял-дэмакратамі, прыцягнуў толькі некалькі сотняў чалавек.

Камуністычная дэманстрацыя ў Парыжы.

ПАРЫЖ, 7-XI. Не зважаючы на дрэннае надвор'е дэманстрацыя ў Іўры (ваколіцы Парыжу), скліканая кампартыяй у адзнаку 10-цігодзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі, прайшла в вялікім посьпехам. Праз вуліцы былі ўрачыстуцы чырвоныя палотны з надпісамі: „Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся", „Няхай жыве расейская рэвалюцыя", „Вечная памяць мучанікам Сако і Ванцэці", „Патрабуем усеагульнае амністыі" і іншыя.

Мэр Іўры камуніст Марэн сказаў прывітаньне парыскаму пралетарыяту ад імя чырвонага Іўры. Выступіўшы пасьля гэтага Манмусо падкрэсьліў, што расейская рэвалюцыя мае моцную базу ў сваіх прафсаюзах, якія яднаюць некалькі мілёнаў членаў.

„Трэба быць гатовымі да абароны расейскае рэвалюцыі—гаворыць далей Манмусо—і аддаць гэтаму нашу энэргію, сканцэнтраваную ў тысячах прафсаюзных арганізацый".

Пасьля Манмусо выступіў Марты, якога спаткалі авацыяй. Марты заклікаў да барацьбы за амністыю. Гэтая барацьба, паводле яго слоў, павінна стаць складаною чысткаю агульнае барацьбы за скасаваньне буржуазеі і захоп улады.

Выступіўшы генэральны сэкратар ЦК камсамолу Фэро заявіў: „Клянёмся, што вы будзеце змагацца за вашую бацькаўшчыну—СССР. Прысягайце, чырвоныя салдаты".

Далей на трыбуне зьявіліся т.т. Кашэн і Дорыё, маніфэстанты наладзілі ім бурную авацыю. Кашэн заявіў: „Рэвалюцыя непераможна. Якім гонарам у гэты дзень павінны быць перапоўнены сэрцы расейскіх рабочых". Дорыё заявіў: „на нас ляжыць задача—весьці далей, пашыраць і паглыбляць канкрэтныя горачныя вынікі, дасягнутыя першаю Савецкаю Рэспублікаю".

Дэманстрацыя прайшла бяз усякіх інцыдэнтаў.

Сэнатар Бора аб 10-й гадавіне Кастрычніка.

ВАШЫНГТОН, 8-XI. Сэнатар Бора зьвярнуўся да карэспандэнта ТАСС з прывітальным лістом у зьвязку з 10-мі ўгодкамі Кастрычнікавае рэвалюцыі.

У сваім лісьце сэнатар Бора заяўляе, што ўсе пытаньні між Злучанымі Штатамі і СССР вымагае, каб такая згода адбылася неадкладна. «Праз усе 10 гадоў,—піша сэнатар Бора, — савецкі ўрад карыстасьцца амаль усеагульным падтрыманьнем расейскага народу і мае ўсе адзнакі трывалаасьці. Нельга ўжо больш адгаварвацца, што савецкі ўрад доўга ня вытрымае. Я лічу, што ўрад гэты зьяўляецца сталым і чым хучэй сьвет прызнае гэты факт і зробіць з яго належныя вывады для сваёй палітыкі, тым лепш будзе для ўсяго сьвету».

Вечар аўстрыйскае кампартыі.

ВЕНА, 7-XI. 6-га лістапада ўвечары ў Венскай вялікай канцэртнай залі (самае вялікае канцэртнае памяшканьне ў Вене) адбыўся ўрачысты вечар з тэатральнаю і канцэртнаю праграмаю, наладжаны аўстрыйскай камуністычнай партыяй. Вечар прывабіў вельмі шмат народу. Сцены з кпінамі над прусінімі сацыял-дэмакратамі і меншавікамі і сцэны ўхваленьня Кастрычнікавае рэвалюцыі адбываліся пад бурныя воплескі.

Прыём у ковенскім пасольстве СССР.

КОЎНА, 7-XI. З прычыны 10-ых угодак Кастрычнікавае рэвалюцыі ў паўнамоцным прадстаўніцтве СССР адбыўся прыём, на якім прысутнічалі прынятаўныя даверанага ў справах СССР Скалава прадстаўнік літоўскага ўраду, дыпляматычныя прадстаўнікі Нямеччыны, Францыі, Італіі, Латвіі, Даніі і Эстоніі, а таксама консулы Чэхаславакіі, Аўстрыі, Фінляндыі, Швэдыі і Нарвэгіі.

Суд над т. Польлітам.

ЛЁНДАН, 9-11. Справа Польліта, Біча і Стрэдвіга (абвінавачаных у паклёпе проці высланага з СССР Скотта) скончылася абвінаваўчым прысудам усіх падсудных. Польліт засуджан на 100 фунтаў стэрлінгаў штрафу, а Біч і Стрэдвіг—на 50 фунтаў стэрлінгаў.

Клясавая вайна ў Нямеччыне.

ЛЁКАУТ БОЛЬШАСЬЦІ НА ТЫТУНЁВЫХ ПРАДПРЫЁМСТВАХ.— РЭЙНСКАЯ ВОБЛАСЬЦЬ АХОПЛЕНА СТАЧКАМІ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ.

БЭРЛІН. Лёкаут рабочых цыгарных фабрык ахапіў 6.000 чал. у Саксоніі і 8.000 чал. у Сілезіі. Таксама спынена праца цыгарных фабрык у Гельдэрбэрзе.

У Брэмене 17 уласьнікаў тытуневых фабрык не згадзіліся на патрабаваньні рабочых павялічыць заработак на 15 проц. Цыгарныя фабрыканты папярэдзілі рабочых аб скасаваньні калектыўных угавораў 12-га лістапада. Некальні сот рабочых спынілі працу.

У Рэйнскай акрузе абвясьцілі забастоўку рабочыя ящчэ самі тэкстыльных прадпрыёмстваў. У тэкстыльнай прамысловасьці леваўзьбярэжнае Рэйнскае акругі бастуе каля 8000 чал.

ЗВАЛЬНЕНЬНЕ 55.000 ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ.

БЭРЛІН, 9-XI. На тэкстыльных прадпрыёмствах Рэйнскае вобласьці поўнасьцю праведзен лёкаут усіх рабочых. Толькі на некаторых невялікіх прадпрыёмствах прадпрыёмцы замест неадкладнага лёкауту абвясьцілі рабочым аб звальненьні іх праз 2 тыдні. Лёкаут ахапляе блізка 55 тысяч рабочых і работніц (апроч 8-мі тысяч, якія ўжо баставалі).

На працэсе вэнгерскіх рэвалюцыянэраў.

Дэманстрацыя падсудных у часьць Кастрычнікавае рэвалюцыі.

ВЕНА, 8-11. 5 лістапада, на 14-ты дзень працэсу Санто і т.т. скончыліся спрачкі бакоў.

7-га лістапада (15-ты дзень працэсу Санто і т.т.) падсудным было дадзена апошняе слова.

У апошнім слове САНТО заявіў: „Мы лічым сваёю пралетарскаю бацькаўшчынаю Савецкі Саюз. Нашая пралетарская бацькаўшчына, на яную нападаў пракурор, сьвяткуе сёньня свае 10-цігадовы юбілей". ПРЫ ГЭТЫХ СЛОВАХ САНТО УСЕ ПАДСУДНЫЯ ЎСТАЮЦЬ З СВАІХ МЕСЦ; старшыня патрабуе, каб яны сялі, але 20 падсудных адмаўляюцца і стаяць. Санто кажа далей: „Ад імя вэнгерскіх рабочых і сялян, а таксама ад імя таварышоў, зьняволеных у астрогах, мы пасылаем адсюль СССР у 10-ыя ўгодкі пераможнае дыктатуры пралетарыяту свае рэвалюцыйнае прывітаньне. Тут, на лаўцы падсудных, наша сэрца б'ецца заадно з сэрцам суседзьветнага пралетарыяту, у часьць пралетарыяту СССР, які стварыў сапраўднае суседзьветае дзіва ў краі, дзе пахаваны наш бясьсьмертны Ленін". Пасьля гэтае частні прамовы Санто, падсудныя, якія сталі, пры гэтым сядзацца.

«Я веру ў камуністычную партыю Вэнгрыі,—скончыў Санто,—і ўзброенае паўстаньне вэнгерскага пралетарыяту".

Пасьля гэтых слоў Санто старшыня пазбаўляе яго слова. Іншым падсудным старшыня забараняе памінаць пра СССР. Нікому з падсудных старшыня не дазволіў дагаварыць да канца.

20 падсудных, якія дэманстрацыйна сталі ў часе прамовы Санто, дысцыплінарна пакараны зьняволеньнем на 7 дзён у цёмныя нарцэры.

Параход „Чычэрын" вызвалены.

ЛЁНДАН, 9-11. Агенцтва Рэйтэра паведамляе з Александрыі: мешаны суд ухваліў пастанову аб вызваленьні расейскага параходу «Чычэрын» нядаўна арыштаванага ў Александрыі ў якасьці адказу на арышт савецкаю ўладаю параходу „Косьці", ранейшага «Інкэрмана».

«Чычэрын» неадкладна выходзіць з Александрыі.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрыманы а 1-ай гадзіне ўночы).

ПАСТАНОВА ЦК УсеКП(б).

Апазіцыя разьбіта ўшчэнт у партыйных арганізацыях. Партыя цалкам, яе рабочыя ячэйкі ў асаблівасьці, ясна і рашуча адмежаваліся ад апазіцыі, ізаліюючы яе, як антыпартыйную і раскольніцкую кучку. Бачачы сваю ізаляванасьць, лідары апазіцыі пераходзяць на «новы», меншавіцкі шлях. Яны адварачваюцца ад партыі, рвуць з ёй апошнюю сувязь і пачынаюць зьвяртацца за дапамогай к чужым партыі сілам—мяшчанам, буржуазным імпэрыялістым і іншым непралетарскім гушчам.

Антысавецкія вулічныя выступленьні Троцкага, Зіноўева, Каменева, Сьмілгі і інш. у дзень 10-цігодзьдзя Кастрычніка ў Маскве і Ленінградзе, гвалтоўны захват аудыторыі Маскоўскай вышэйшай тэхнічнай школы дзеля наладжаньня нелегальнага антыпартыйнага сходу, збойства прадстаўнікоў партыйнай лініі на арганізаваных апазіцыяй нелегальных сходах,—усе гэтыя і падобныя ім факты апошніх дзён кажуць аб тым, што апазіцыя, прайграўшы барацьбу ў партыі і будучы зьбіта ў ёй перад усёй рабочай клясай у часе дэманстрацыі 7-га лістапада, пачынае зьбіраць паўкол сябе варожыя рабочай клясе сілы і падрыхтоўвае новыя антысавецкія выступленьні.

Лічачы падобную чыннасьць апазіцыі і перш за ўсё яе лідараў зусім недапусьцімай і абсалютна не адпавядаючай званьню членаў нашай ленінскай партыі, ЦК УсеКП(б) прызнаў неабходным перадаць у ЦКК пытаньне аб апошніх антыпартыйных выступленьнях апазіцыі. Адначасна з гэтым ЦК УсеКП(б) ухваліў запрапанаваць усім арганізацыям партыі ў сваёй працы за ленінскую партыйнасьць і за захаваньне адзінства нашай партыі кіравацца ніжэйшым:

1) Ужыць рашучыя крокі супроць спроб апазіцыі перанесьці дыскусію за межы партыі;

2) выступленьні ўсіх членаў партыі перад непартыйнымі коламі павінны адбывацца дзеля растлумачэньня і абароны лініі партыі. Апазіцыянэраў, якія будуць выступаць на непартыйных сходах супроць палітыкі партыі, зараз-жа выключаць з партыі;

3) не дапускаць нелегальных сходаў, якія скліканцца апазіцыянэрамі, а ў выпадку іх скліку, ня гледзячы на ўжытыя арганізацыямі крокі, распускаць іх сілай партыйных арганізацый і рабочых.

ПАДЗЕМНЫЯ ШТУРШКІ Ў КРЫМЕ.

СЫМФЭРОПАЛЬ, 10-XI. У Алушце ўночы на 8-га лістапада адчуваўся запяжны падземны штуршок сілай да 4-х балаў, які справаджаўся гулам. У ноч на 10-га лістапада адзначаны хістаньні сілай у 2—3 балы.

За дзень.

Бясчынствы чорнае сотні.

Кітайская белагвардзейшчына дапасавала напад на савецкае консульства ў Шанхаі да дню 10-цігодзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі. Расейская эміграцыя ў Кітаі, нацкаваная ангельскай прэсай і іншымі эміграцкімі чорнасоценнымі газэтамі, доўгі час рыхтавалася да гэтага наскоку.

Шанхайскія фашысты на сваім першым арганізацыйным сходзе на запытаньне, што яны будуць рабіць, зусім ясна адказалі, то першачарговай задачай фашыстаў павінна быць дамагчыся зьнішчэньня савецкага консульства ў Шанхаі. Аб гэтым яны шмат разоў афіцыйна агалашалі, і наш генэральны консул ня раз напераджаў аб гэтым упаўнаважанага па замежных справах кітайскага ўраду ў Шанхаі. Але ні-якіх мер ні з боку муніцыпальнай паліцыі, ні з боку кітайскага ўраду прынята ня было.

Становішча ўсё больш абвастралася. Усё часьцей пачыналі зьбірацца асобныя групы белагвардзейцаў каля будынку пашага консульства, гандлёвага прадстаўніцтва і Дальбанка, якія кідалі каменьні і выбівалі шыбы ў гэтых будынках. Як заўсёды бывае ў гэткіх выпадках, кітайская паліцыя ніякай барацьбы з расейскімі белагвардзейцамі не вяла. Больш таго, быў вызначан спэцыяльны атрад пераважна з расейскіх белагвардзейцаў, якому даручалася нібы «ахова» савецкага консульства.

Ангельская дыпляматыя ўсё дабівалася свайго. Англіі абавязкова патрэбна, каб у Кітаі ня было ніякіх савецкіх афіцыйных прадстаўніцтваў. Наскок на савецкае консульства і напярэдняя агітацыя, якая праводзілася ангельскай прэсай у Кітаі, зьяўляецца лепшым сьведкай таго, што арганізатарам гэтага наскоку зьяўляецца ангельскі імпэрыялізм. Мы ўпэўнены ў тым, што Англія давала грошы на гэты наскок. А таму ўсю адказнасьць за бясчынствы чорнае сотні ў Шанхаі мы ўскладаем на галаву ангельскай рэакцыі. Зусім зразумела, што з нанкінскага ўраду ня можа быць зьнята адказнасьць за гэтыя бясчынствы. Нанкінскі ўрад добра ведаў аб тым, што гэткага роду наскок рыхтуецца і ён павінен быў наладзіць патрэбную ахову савецкіх прадстаўніцтваў, якія знаходзяцца на яго тэрыторыі.

Савецкія грамадзяне ў Шанхаі знаходзяцца ў вялікай небясьпецы. Чорная сотня рыхтуе пагром. Мы будзем дамагацца, каб нанкінскі ўрад узяў на сябе ахову савецкіх грамадзян. Мы будзем ужываць усе сродкі, якія толькі ёсьць у нашым распараджэньні для ўзьдзейнічаньня на нанкінскі ўрадкаб спыніць тыя бясчынствы, якія расейская белагвардзейшчына дазваляе сабе ў Кітаі ў адносіне да савецкіх прадстаўніцтваў.

Супроцьітальянскі дагавор.

Тэлеграф паведамляе, што гэтымі днямі будзе падпісаны Франка-Паўднёва-Слаўскі дагавор. Бясспрэчна, што гэты дагавор усім сваім вастрыём накіраваны супроць Італіі.

Францыя, якая да гэтага часу карысталася бязьмежным уплывам на ўсе Балканскія справы, вельмі занепакоілась канфліктам, які ў апошнія часы ўзьнік паміж Албаніяй і Паўднёва-Славіяй. Кожнаму ясна было, што Італія вядзе заўзятую імпэрыялістычную палітыку на Балканах і ставіць сабе мэтай захапіць Албанію. У тым канфлікце, які быў паміж Албаніяй і Паўднёва-Славіяй, адразу відаць было, што Італія падбухторвае Албанію да новай вайны.

Францыя, якая зьяўляецца фактычным кіраўніком Паўднёва-Слаўскіх спраў, увесь час выказвала асаблівую зацікаўленасьць да ўзаемаадносін паміж Паўднёва-Славіяй і Албаніяй. У гэтым пытаньні Францыя, галоўным чынам, кіравалася мэтай паслабленьня італьянскага ўплыву па Балканах. Да гэтага часу посьпехі Францыі ў гэтым пытаньні былі вельмі слабыя.

Гэтым і тлумачыцца тэрміновасьць заключанага дагавору паміж Паўднёва-Славіяй і Францыяй, згодна якога ўплыў Францыі на Паўднёва-Славію, а адгэтуль па ўсе Балканскія справы ящчэ больш пашырасьцца.

Перадвыбарныя настроі ў Польшчы і Зах. Бел.

Галоўнай тэмай дня ў Польшчы зьяўляюцца надыходзячыя выбары ў новы сойм. Праўда, выбары адбудуцца ящчэ ня так хутка, ящчэ нават сучасны сойм ня зусім скананў—хаўтуры яго адбудуцца канчаткова толькі 28 лістапада, калі скончыцца роўна 5 гадоў, на які быў выбран сойм. Пасьля гэтага толькі праз 3 месяцы адбудуцца выбары ў сойм і сэнат. Тым ня меней усе партыі ўжо цяпер пачалі рыхтавацца да выбараў. Агульнаю атмасфэру на гэтым пытаньні можна акрэсьліць як наспрыяючую для ўраду Пілсудзкага: пэпэсы, вызваленцы і іншыя левыя кірункі, за выключэньнем «партыі працы» і іншых санацыйных групак, — проці ўраду Пілсудзкага. Аб усёй правіцы і цэнтры і гаварыць ня прыходзіцца—яны яскрава варожы да сучаснага ўраду, але іх шансы на посьпех пры новых выбарах досыць слабыя. Бязумоўна, агульны палітычны настрой у Польшчы вельмі значна схіліўся ўлева, што тлумачыцца шкодным для Польшчы палітыкай шматлікіх правых урадаў, якім палажыў канец маёвы пераварот Пілсудзкага. Але і Пілсудзкі з сваім каліцыйным урадам ня здолеў сабраць каля сябе больш шырокія левыя колы польскага грамадзянства, якое стала патроху ад яго адварочвацца, бо палітыка яго найшла пейкімі спачатку незразумелымі, а потым і зусім яснымі самаўладнымі—фашыстаўскімі шляхамі.

Яго палітыка, якая імкнецца цяпер разьбіць некаторыя апазіцыйныя да яго партыі, дае агулам пязначныя вынікі. І таму трэба чакаць, што выбары будуць мець сваім вынікам правал Пілсудзкага і перамогу левых над правымі.

Што тычыцца Зах. Беларусі, дык трэба з поўнасьцю чакаць, што і ў

СССР У ДНІ ДЗЕСЯТАЕ ГАДАВІНЫ.

Закладка Днепрабуду.

ЗАПАРОЖЖА, 8-XI. Сёньня раніцою адбылася ўрачыстая закладка Днепрабуду.

«На працаўнікоў Днепрабуду—сказаў у сваёй прамове Пятроўскі—глядзіць зараз ня толькі ўвесь СССР, але і пралетарыі ўсяго сьвету».

Старшыня СНК Украіны тав. Чубар сказаў: «Працоўныя ня раз перамагалі ў барацьбе з савецкім ворагам. У сучасны момант яны атрымалі перамогу над прыродаю, прымушаючы Днепр працаваць на карысьць рабочых і сялян».

Пасьля выступленьня т. Скрыпніка, Сухамліна, Шліхтэра, Вінтэра і інш. слова для прывітаньня атрымаў член ЦК нямецкае кампартыі і сэкратар саюзу чырвоных франтавікоў Леаў, які сказаў: «Запытайце дэлегатаў, прыехаўшых на сьвяткаваньне Кастрычніка, няхай яны скажуць, у якім краі рабочыя маюць магчымасьць так будавацца і жыць, як у Савецкім Саюзе. Мы, чырвоныя франтавікі, клянёмся змагацца за Савецкі Саюз і за справу Леніна».

Пасьля прывітальных прамоў, члены ўкраінскага ўраду, разам з дэлегацыямі, у прысутнасьці 20 тысяч рабочых і сялян, урачыста заклалі падмурак будучае станцыі. Пасьля цэрамоніі закладкі, члены ўраду ізноў узышлі на спэцыяльна прыгатаваную вышку, дзе была прадэманстравана праца экс-матораў, аўстрыйскіх вагончыкаў і бурэньне скал.

У 11-ю ГАДАВІНУ ДА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ ПАВЕТРАНЫХ СІЛ.

Урачыстае пасяджэньне ТДА-Авіяхіму.

МАСКВА, 9-XI. 9-га лістапада ў Вялікім Тэатры адбылося ўрачыстае пасяджэньне цэнтральнае рады ТДА-Авіяхіму СССР, супольна з лётным складам вайсковых і паветраных сіл Чырвонае арміі, рабочымі авіяцыйнае прамысловасьці і пралетарскімі арганізацыямі Масквы, прысьвечанае 10-цігодзьдзю Кастрычнікавае рэвалюцыі і вынікам авіяцыйнага будаўніцтва Саюзу ССР.

На пасяджэньні прысутнічалі **Сталін, Рыкаў, Калінін, Варашылаў, Куйбышаў, Уншліхт, С. Ф. Каменеў, Бубноў, Баранаў, Будзёны, Мукіевіч і інш.** Ад імя ўраду СССР вітаў прысутных Калінін. Начальнік начальніка вайскова-паветраных сіл т. Алконіс агаласіў загад Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету СССР, у якім абвяшчаецца падзяка лётнаму складу вайскова-паветраных сіл Чырвонае арміі і адзначаецца асаблівая заслуга авіяцыйных часьцей, якія з посьпехам правялі зьлёт у Маскву ў дзень сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі. Некаторым камандзірам паветраных сіл будуць выдадзены прэміі.

Камандзіры №-скае вайскова-паветранай часьці „Паш адказ Чэмбэрлену“ Маслаў і Аляксеў ад імя лётнага складу гэтае часьці, тэхнічны дырэктар заводу «Ікар» Ермалаеў, рабочы авіязаводу т. Барабашкін, старшыня авіятэсту т. Урываеў запэўнілі сход, што пакладуць усю моц на далейшае ўдасканаленьне вайскова-паветраных сіл і авіяцыйнае прамысловасьці.

Чырвоных лётчыкаў віталі **Аліўе**—ад францускіх франтавікоў і **Макоўскі**—ад нямецкіх франтавікоў. **Зьяўленьне на трыбуне старшыні ТДА-Авіяхіму СССР і старшыні СНК СССР Рыкава выклікала доўгую авацыю.**

Пасьля прамовы т. Рыкава па ўсёй залі пры гучных воплесках чуюцца выгукі: „Сталіна“. Тав. Сталін зьвярнуўся да прысутных з кароткім прывітаньнем. **Пасьля прамовы Сталіну ізноў была наладжана авацыя.**

Падарункі 10-е гадавіны.

МАСКВА, 10-XI. Ня спыняюць падыходзіць паведамленьні пра сьвяткаваньне ўгодак Кастрычніка ў правінцыі.

У Сталінградзе ў дні сьвяткаваньня ўрачыста адчынены дзьве новыя трамвайныя каляіны ў аколіцы гораду і вялікі клюб металістаў, а таксама зроблена закладка вялікага мэханізаванага заводу сілікатнае цэглы.

У Нікольску-Усурыйскім пушчаны ў ход два новыя заводы—маслабойны і рыса-адсартовачны.

У глухіх паветах **Сямипалацінскае** губэрні сярод качоўнікаў адчынена 5 культурных пунктаў-гарадкоў з бібліятэкамі, амбуляторыямі, паштовымі аддзяленьнямі, хатамі-чытальнямі і школамі.

Ва Ўладзіміры адчынен новы ткацкі корпус на фабрыцы «Пионер», разьлічаны на тысячу варстатаў, зроблена закладка паліклінікі і новае прадзільнае фабрыкі на 100 тысяч верацёнаў.

У Благавешчанску адчынены дзіцячыя сады, ясьлі, начлежка і акруговая сельска-гаспадарчая і культурна-прамысловая выстаўка.

У Воршні, ля Наўлава на Ацэ, пушчана ў ход фабрыка хірургічных прыладаў, у Карэнскай—фабрыка металічных вырабаў, у сяле Карме—мэханізаваная фабрыка сцыморыкаў.

У Багародзку,—цэнтры гарбарнае прамысловасьці—адчынен новы вадапровод.

У Кастраме закладзена электрастанцыя на 18 тысяч кілёват.

У Бранскай губэрні, недалёка ад станцыі Белыя, на балоце закладзена раённая электрастанцыя магутнасьцю ў 22 тысячы кілёват. Закладка адбылася ў прысутнасьці старшыні ВСНГ РСФСР тав. Лобава.

У Скарагавіне закладзена новая тэкстыльная фабрыка, **у Бежыцы** адчынены—школа 7-мігодка, начны санаторы, зроблена закладка хлебазаводу і вялікае грамадзкае сталоўкі.

У Казакстане, на Рыдэры, пушчан у ход новы сьвінцовы завод, **у Дасморы** скончана бурэньне шчыліны, у якой выкрыты новыя багатыя нафтавыя залежы; **у Карсапаі** адноўлены джэкаранскія медныя рудзікі і адчынена вузка-калейная чыгунка даўжынёю блізка 70-ці вёрст.

У Уральску адчынен помнік Леніну, **у Акмолінскай губэрні** пушчаны ў ход 4 паравыя млыны і 2 маслазаводы.

У Кізыл-Ардзе адчынена вялікая краявая больніца, школы.

ПЕРШЫ Ў ГРУЗІІ РАБОЧЫ УНІВЭРСЫТЭТ.

ТЫФЛІС, 9-XI. Учора адбылося ўрачыстае адчыненьне Тыфліскага рабочага унівэрсытэту, першага ў Грузіі.

Кастрычнікавы вечар у Сьвярдлоўскім Унівэрсытэце.

МАСКВА, 9-XI. 8-га лістапада адбыўся вечар, прысьвечаны 10-й гадавіне Кастрычніка, наладжаны Камуністычным Унівэрсытэтам імя Сьвярдлова. Томскі ў сваёй прамове напомніў сходу аб тым вялізарным і асноўным прынцыпе вучэньня Леніна, аб якім некаторыя ў шэрагах нашае партыі пачалі забываць. Толькі пры адзінай, моцна зьяднанай партыі, з выразна-акрэсьленай і клясававытрыманай праграмай пралетарыят сялянскай Расеі мог перамагчы.

ДАМАНСТРАЦЫЯ ПРАЦОЎНЫХ БАКУ.

БАКУ, 7-XI. Сьвяткаваньне 10-цігодзьдзя Кастрычніка ў Баку прайшло з нячуваным уздымам. Звыш чым стотысячная дэманстрацыя запоўніла ўсе галоўныя вуліцы гораду. Вельмі добрае ўражаньне рабілі маладыя рабочыя батальёны, якія дэманстравалі свае дасягненьні да 10-цігодзьдзя Кастрычніка.

Дэманстрацыю віталі прадстаўнікі ўраду, партыйных, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый. На дэманстрацыі прысутнічалі консулы і прадстаўнікі чужаземных дзяржаў.

7 ЛІСТАПАДА Ў АДЭСЕ.

АДЭСА, 9-XI. Сьвяткаваньне 10-е гадавіны Кастрычніка прайшло з вялікім уздымам. У дэманстрацыі 7-га лістапада брала ўдзел 150 тыс. адэскіх пралетарыяў. Цягнулася яна амаль увесь дзень. Дасканала арганізаваны карнавал зло высьмейваў міжнародную буржуазею і старую царскую Расею. У часе параду гарнізону камандаваньне корпусу і прадстаўнік мясцовае ўлады ўзнагародзілі падарункамі 20 прыкладных камандзіраў і палітпрацаўнікоў.

6-га і 7-га лістапада адбылося адчыненьне новых культурных установаў.

За выключэньне з партыі лідэраў апазіцыі.

Пастанова бюро МК УсеКП(б).

МАСКВА, 9-XI. 1) Бюро МК сьцьвярджае, што а) дэманстрацыя сіл маскоўскага пралетарыяту ў дзень 10-цігодзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі паказала вялізны палітычны ўздым і поўнае давер'е да партыі міліённае арміі маскоўскага пралетарыяту. Маскоўскі пралетарыят дэманстраваў сваю адданасьць міжнароднай рэвалюцыі і паказаў свае сілы і сваю няхрушную волю да сацыялістычнага будаўніцтва. Спробы троцкісцкае апазіцыі арганізаваць контр-дэманстрацыю асобных групак збанкруціўшых фракцыянэраў, нацярпелі ганебнае палітычнае паражэньне; б) гэтае выступленьне апазіцыі з контр-дэманстрацыяй проці партыі ў 10-ю гадавіну Кастрычнікавае рэвалюцыі маскоўскі камітэт ня можа разглядаць іначай, як выступленьне антысавецкае, якое вядзе да падрыву дыктатуры пралетарыяту.

2) З тае прычыны, што дзейнасьць апазіцыі ў даны пэрыяд зьяўляецца дзейнасьцю другое небальшавіцкае, а троцкісцка-меншавіцкае, бюро МК лічыць неабходным выключэньне з партыі лідэраў апазіцыі Троцкага, Зіноўева, Каменева, Сьмілгі і інш. лідэраў апазіцыі і ўсіх актыўных раскольнікаў, як меру, накіраваную проці арганізацыі другое партыі і легальнае палітычнае працы антысавецкіх элементаў.

3) Бюро МК лічыць зусім немагчымым пакідаць лідэраў апазіцыі на адказных пасадах савецкае дзяржавы, якія яны могуць выкарыстаць для барацьбы проці партыі ў сваіх фракцыянэрска-меншавіцкіх мэтах. Бюро МК лічыць неабходна падаць гэтую пастанову неадкладна ў ЦК партыі.

Кіеўскі партактыў за пастановы пленуму ЦК.

КІЕЎ, 9-XI. Агульна-гарадзкі сход партактыву кіеўскае арганізацыі, заслухаўшы даклад аб кастрычнікавым аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б), ухваліў рэзалюцыю, у якой цалкам далучыўся да ўсіх пастаноў пленуму, між іншым і да пастановы аб выключэньні з складу ЦК т.т. Троцкага і Зіноўева.

Узьбекскія партарганізацыі проці апазіцыі.

ТАШКЕНТ, 9-XI. Ташкенцкая акруговая партыйная канфэрэнцыя па дакладзе т. Зялінскага аб выніках пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) ухваліла рэзалюцыю, у якой далучаецца да пастановы пленуму аб выключэньні Зіноўева і Троцкага са складу ЦК.

Выключэньне з УсеЛКСМ за фракцыйнасьць.

ЛЕНІНГРАД. Пленум Ленінградзкага губкому камсамолу выключыў за фракцыйную працу з губкому і з УсеЛКСМ Дразгова і Укконэ, раней выключаных за фракцыйнасьць з УсеКП(б).

Поўны правал апазіцыі.

МАСКВА. Ад пачатку ўнутрыпартыйнае дыскусіі да 10 кастрычніка на 94 сходах партактываў губэрскіх і павятовых гарадоў і райёнаў прысутнічала 5868 чалавек. **Галасавала за тэзісы ЦК** да 15 партзьезду і за пастановы кастрычнікавага пленуму ЦК **58638, проці 186, пры 34-х, якія ўстрымаліся.**

За 9 лістапада па трох райёнах Масквы на сходах 24-х ячэек прысутнічала 3532 чал. У спрэчках выступала 231, у тым ліку 18 апазіцыянэраў. **За рэзалюцыі**, якія ўхваляюць тэзісы **ЦК і пастановы кастрычнікавага пленуму**, галасавала **3398, проці 120 пры 14**, якія ўстрымаліся.

НІВОДНАГА АПАЗІЦЫЯНЭРА.

ТАШКЕНТ, 9-11. 7 лістапада адчынілася 6 партыйная канфэрэнцыя Сярэдне-Азіяцкае вайсковае акругі. З дакладам ад цэнтральнага камітэту партыі выступіў спатканы авацыяй старшыня сярэдня-азіяцкага бюро ЦК УсеКП(б) т. Заленскі. Выступаўшыя ў спрэчках дэлегаты адзначалі, што ў частках акругі няма ніводнага апазіцыянэра. Дзейнасьць апазіцыі выклікае абурэньне партыйных мас акругі, а таксама і беспартыйных чырвонаармейцаў і камандзіраў.

Пралетарыі прынялі заклік ленінскае партыі.

170 заяў ад рабочых Кіева.

КІЕЎ, 5-11. За апошнія дні ў ленінскі і январскі райпартком запвы аб жаданьні ўвайсьці ў партыю падало 170 рабочых, з іх значная частка з 10-цігадовым вытворчым стажам, Сярод уваходзячых у партыю шмат актыўных удзельнікаў кастрычнікавых боен.

Рабочыя сотнямі ідуць у партыю.

УЛАДЫВАСТОК, 8-11. У зьвязку з кастрычнікавымі сьвятамі началася масавая падача заяў рабочых аб уваходзе ва ЎсеКП(б). За апошнія дні паступіла ў ячэйкі 147 заяў, з іх каля паловы ад усходніх рабочых.

Аб масавым уваходзе ў партыю паведамляюць таксама і з іншых гарадоў.

Каля 3.000 новых партыйцаў.

У апошні час заўважана павялічаная цяга рабочых у партыю. За мінулыя 2 тыдні ў райкомы маскоўскае арганізацыі па дадзена 1269 заяў ад рабочых і работніц.

У Ленінградзе да 10-тых угодак па ўсіх райёнах пададзена заяў ад рабочых аб залічэньні ў УсеКП(б), водлуг няпоўных вестак—1332.

Падпольная друкарня апазіцыі ў Хэрсоне.

ХЭРСОН. Акруговая кантрольная камісія разглядзела справу 19-ці фракцыянэраў, друкаваўшых у падпольнай друкарні на шапірографе антыпартыйную літаратуру, падкідваўшых лістоўкі на заводах у скрынкі для струмэнтаў, зьбіраўшых подпісы пад апазіцыйнымі плятформамі.

У час разбору справы частка фракцыянэраў адмовілася даваць адказы і паладзіла абструкцыю. Згодна пастановы камісіі, восем чалавек выключана з партыі, прычым тры начале з кіраўніком Пташыным бяз права ўваходу ізноў у партыю.

ПРЫЕЗД НОВЫХ ЧУЖАЗЕМНЫХ ДЭЛЕГАЦЫЙ.

МАСКВА, 3-XI 3-га лістапада ў Маскву прыехалі новыя чужаземныя рабочыя дэлегацыі: **дацкая—23 асобы, эстонская—22 асобы і фінская—8 асоб.**

На Кастрычнікавым вакзале дэлегацыі былі спатканы шматлікімі дэлегацыямі прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый.

МАСКВА 9-XI У Маскву прыехала амэрыканская рабочая дэлегацыя, у складзе 25 чал., ад розных прафэсыянальных саюзаў.

Сход чужаземных дэлегатаў.

МАСКВА 9-XI. 6-га лістапада адбылося пасяджэньне ўдзельнікаў усіх чужаземных рабочых дэлегацый у Маскве, прысьвечанае вывучэньню пытаньняў пабудовы і разьвіцьця савецкіх прафсаюзаў. Тлумачэньні па ўсіх пытаньнях, якімі цікавіліся дэлегаты, даваў старшыня ЎЦСПС т. Томскі.

Вечар зблiжэньня міжнародных і савецкіх вучоных.

МАСКВА, 10-11. Наладжаны 9 лістапада домам вучоных банкет у чэсьць чужаземных вучоных і грамадзкіх дзеячоў, якія знаходзяцца ў Маскве, абярнуўся ў яскравую дэманстрацыю салідарнасьці сусьветнае і савецкае навукі. На банкеце прысутнічалі самыя выдатныя вучоныя і дзеячы мастацтва СССР і розных краёў Эўропы і Амэрыкі. Гасьцей вітаў ад імя савецкага ўраду намесьнік старшыні СНК РСФСР тав. А. М. Ляжава, а таксама Нарком аховы здароўя Сямашка і ад НК асьветы РСФСР—Хадарэўскі і інш.

У адказ на прывітаньні выступалі чужаземныя вучоныя і пісьменьнікі.

Французская буржуазея пра Кастрычнік.

(З успамінаў).

„Здраднікі, юды, трусы!“—так спаткаў нас буржуазны Парыж, калі ў пачатку 1918 г., пасьля ліквідацыі нашага атраду, мы варочаліся ўжо адзіночным парадкам у сталіцу францускай рэспублікі, каб, зьмяніўшы афіцэрскую вопратку на сінюю сьвітку рабочага, паспрабаваць на фабрыках і заводах знайсьці сабе новыя сродкі для жыцьця. Я памятаю, як у першы дзень нашага прыезду ў французкую сталіцу, увайшоўшы ў адзін з сярэдніх рэстаранчыкаў, разьмеркаваных па вялікіх бульварах, каб напаўдноваць, мы зараз-жа стыкнуліся з выразна варожым да нас настроем прысутнай там дробна-буржуазнай грамады.

«Гэта расейцы, што прадалі Францыю немцам», перадавалася з вуснаў у вусны.

А адзін з раздабраўшых на добрых харчох гандляр, зразумела, ніколі ў жыцьці ня бачыўшы фронту, выгукнуў на ўсю залю, дэманстратыўна паказваючы пальцам у наш бок: „Дзіўлюся, як гэта гэтым здраднікам дазваляюць яшчэ гуляць на гораздзе і насіць на грудзёх значкі заслугі Францускай рэспублікі!“

„Я гэтыя значкі заслужыў, абараняючы ваш Парыж і вашу Францыю ад нямецкага наступу,—адказаў яму ў тахт адзін з нашых таварышоў-інвалід, якому адарвала нагу пад Рэймсам,—але, калі вам так хочацца, дык я магу іх зараз-жа аддаць назад!“

Прысутныя супакоіліся ад гэтых слоў нашага таварыша па зброі, а тоўсты гандляр, расплаціўшыся, барджэй уцёк з рэстарана, мармычачы сабе нешта пад нос пра „расейскіх сьвіней“ і „бальшавіцкіх здрадзікаў“.

Хутка і мы пакінулі варожы рэстаран, не жадаючы слухаць незаслужаныя зьнявагі. Але гэта ўсё яшчэ было дарма, бо ў іншых месцах з нашых афіцэраў і салдат засьлеплены і справаказаны нагоўп гвалтам зьдзіраў з грудзей францускія баявыя ўзнагароды, зьневажаючы і зьдзекваючыся, як толькі мага. На парыскіх вуліцах ня толькі нельга было зьявіцца ў расейскай вайсковай форме, але трэба было ўсімі сіламі ўхіляцца нават гутарыць парасейску,—гэтак варожа ў той час грамадзкая думка Парыжу і ўсёй Францыі была настроена проці нашага рэвалюцыйнага народу, які скінуў з сябе ланцугі капіталістычнага нявольніцтва.

* * *

Каб зразумець і як сьлед ацаніць усю тую дранежнасьць, якая ахапіла ня толькі буйную, але і дробную французкую буржуазею пры вестцы пра выбух Кастрычнікавай рэвалюцыі ў Расеі, пра падпісаньне намі бярэсьць-літоўскага міру з усімі вынікамі, ня трэба забываць, што гэта, пераважна, буйная французкая буржуазея ўскладала на лютаўскую рэвалюцыю ўсе свае надзеі ў сэнсе падначаленьня і паступовага падпарадкаваньня свайму ўплыву народжанай на развалінах імпэрыі Расейскай, зразумела, буржуазнай рэспублікі. Расея, зразумела, будзе далей вазваць з немцамі „да пераможнага канца“, Расея будзе выплачваць з процантамі свае „даўгі“ як ваенныя, так і даваенныя. Расея, паслабленая ўсё-ж такі рэвалюцыяй, на чале з сьлюнявым, кволеньким часовым урадам згодзіцца на ўсе патрабаваньні „вялікадушных“ саюзьнікаў і аддасьць усе свае прыродныя багацьці пад іх поўны эксплёататарскі загад. І французкі буйны буржуа ўжо з радасьцю пацірраў сабе далоні, прадбачачы лёгкі здобыч. Але Кастрычнікавая рэвалюцыя адным сваім магутным узмахам перавярнула дагары нагамі ўсе гэтыя такталенавіта складзеныя пляны міжнародных дранежнікаў-капіталістаў. Кастрычнікавая Расея не захацела весьці далей бяссэнсны і непатрэбны нам вайны, Кастрычнікавая Расея адмовілася рашуча выплачваць старыя царскія „даўгі“, Кастрычнікавая Расея, скінуўшы і вышвырнуўшы, як нягодны цяжар, з свайго краю ўсіх капіталістаў, ня мела ніякага намеру нанова падстаўляць свой карак пад экспляататарскі бізун чужаземнай буржуазеі. Буйныя французкія банкіры і заводчыкі выразна бачылі, што з Чырвоным Кастрычнікам на ўсходзе паўстае нешта новае, нешта моцнае і для іх улады небясьпечнае, і што гэта «нешта», раздушыўшы канчаткова сваіх уласных расейскіх капіталістаў, зьявіцца, нарэшце, да іх, каб патрабаваць адказ за ўсё, учынёнае імі проці працоўных мас. Вось чаму буйны французкі буржуа абурыўся такою жудаснаю нянавісьцю і да нашага Саюзу працоўных, і да Кастрычнікавай рэвалюцыі, і да ўсяго, народжанага ёю.

У нашых асобах ён убачыў рантам сваіх сьмяротных заклятых ворагаў, і ў гэтым, зразумела, ён ніколькі не памыліўся. Што-ж датычыць дробнай французкай буржуазеі, усіх гэтых недарослых гандляроў, саматужнікаў, уласьнікаў падазроных кафэ і рэстаранаў, дык яны, натуральна, ішлі на павадку ў сваёй буйнай буржуазеі, якая нясупынна ўбівала ім рознымі спосабамі, што прапалі іх працоўныя грошы, закладзеныя калісьці ў царскія пазыкі, што бальшавікі ім ніколі нічога не заплацяць. Гэтым самым буйны капіталіст, хітра закранаючы слабую струнку прыроднага французкага гаспадарчыка, які калоніцца за лёс сваіх сантымаў і франкаў, узбуджаў проці нас усю гэтую, досыць такі значную, дробна-буржуазную масу, якая са скуры лузалася, праклінаючы гэтых „юдаў-бальшавікоў“, якія не пажадалі больш ліць кроў свайго пралетарыяту за чужыя нам інтарэсы буржуазеі.

Ну, а пралетарыят у той час у пераважачай сваёй масе, прыбраны ў цьмянасінія салдацкія шынялі, і цаміраючы на фронце, як мухі,—слухаў паклёны аб тым, што праклятая збрыдзеўшая ўсім вайна зацягваецца з-за „здрадніцтва“ Расеі, што бальшавікі „здрадзілі“ агульна-саюзнай справе і што яны—„шпікі“ і „платныя агенты“ нямецкага Вільгельма. Заціснутыя ў той час у жалезныя абцугі вайсковай дысцыпліны, маючы на фронце толькі буржуазную літаратуру, змораныя, стомленыя нясупынна крываваю трохгадоваю вайною, яны і паддаліся спачатку на таленавіта расстаўленую вудачку спрактыкаванай у правакацыйнай працы буржуазеі, абвінавачваючы нас у розных міфічных здрадніцтвах, якія зацягваюць, па іх думцы, і без таго агорклую ім імпэрыялістычную бойню. На шчасьце гэта непаразуменьне між намі і французкім пралетарыятам пягнулася вельмі нядоўга і хутка ў расейскім Чорным моры і ў іншых мясцох французкі працоўны ў салдацкім і матроскім шынялі выразна паказаў усяму сьвету, што ён ачухаўся ад часовага буржуазнага дурману і што яго сымпатыі і інтарэсы далёка ня выходзіцца з імкненьнямі міжнародных капіталістаў.

Гэтак шматсторонна, гэтак характэрна адбыўся вялікі Кастрычнікавы пераварот у цэнтры таго заходня-капіталістычнага краю, дзе зараз ізноў па ангельскай указцы адналася шалёная кампанія проці нашага Саюзу, дзе зараз ізноў, як і ў далёкі час 1918 году, буйны капітал спрабуе ўзброіць проці нас усю, калісьці яму такую пакорную, грамадзкую думку. Толькі цяпер яму гэта наўрад ці ўдасца. Парукаю ў гэтым—нашы вялізнавыя дасягненьні за 10 год і тыя шматлікія рабочыя дэлегацыі Захаду, якія прыехалі сьвяткаваць разам з намі Вялікі Кастрычнік.

Н. БЯЛІНА-ПАДГАЕЦКІ.

Беларусь у сьвяточныя дні.

ГОМЕЛЬ У ДНІ ДЗЕСЯТАЙ ГАДАВІНЫ.

(Ад нашага Гомельскага карэспандэнта).

Гомель штодзённы і звычайны, зьмяніў свой надворны выгляд у ноч з 5 на 6 лістапада. Бліскучымі каралямі ўпалі агні ў цёмны вечар, палягілі стракатымі вянкамі на фасады дамоў, асьвятлілі вітрыны.

Асабліва прыгожа ўбраны завод „Пролетарый“. Вельмі ўдалася эмблема Кастрычніка: языкі полымя ліжуць зямную кулю, глёбус, які паволі круціцца.

Прыгожы фасад кіраўніцтва Заходняй чыгункі. Дасканала паказаны вобраз ф-кі пры ўваходзе ў тэатр імя Калініна. Удалыя дыяграмы страхкасы, якія красоўна гавораць аб вялікіх дасягненьнях Кастрычніка.

Дэманстрацыя.

У панядзелак, 7 лістапада на пляц Волі, як у мора ўліваліся калёны дэманстрантаў з іншых пляцоў і вуліц. Не затрымліваючыся на пляцы, яны праходзілі далей, туды, дзе каля дому саветаў гучаць аркестры, дзе чуецца гучнае ўра.

На трыбуне каля Дому Саветаў прадстаўнікі ўлады, Чырвонай арміі, партыі, прадстаўнікі сялян, жаночага аддзелу і камсамолу.

Міма трыбуны ідзе магутнымі плынямі войска. Гэта ўсё моладзь толькі-што ўзятая ў армію.

Мільгануці стаяй лебедзяў белыя касынкі чырвоных сясьцёр, жудасна глянулі в панцырнікаў гарматы і кулямёты. На панцырніку надпіс:

„Панцырным кулаком адкажам цьвёрдалобым буржуям на правакацыю вайны“.

Гэты панцырнік зрабілі в фанэры чыгуначнікі. Калі трэба будзе, яны зробяць і сапраўдны панцырны кулак са сталі.

Пратуркатаў аўтамабіль МОПР'у з шыбельніцай—жудаснай пагрозай кожнаму, хто адважыцца быць нездаволеным там, па-за кардонам.

Праскакаў стракаты карнавальны натоўп: чаркес, францускі афіцэр, белагвардзеец, блазан. Гэта працаўнікі цырку.

Далікатна кланяючыся праплыла над натоўпам шпетная фігура Чэмбэрлена.

А вось сымбалічная працэсія зруйнаваньня і радаснага 1927 году.

Нясуць плякат: «Становішча савгасу ў першыя гады рэвалюцыі».

Далей—пяшчасны конік цягне саху. Конніка падганяюць:

— І-но, жвавай!

Селянін у падранай сьвітцы і стаптаных ботах.

За ім нясуць другі плякат:

„Становішча савгасу ў 1927 годзе“.

За плякатам туркоча трактар і жняярка, хрукаюць на фурманцы сытыя сьвіні.

Селянін у лапцях, у шэрых даматканых штанах, у якімсьці падраным кафтане вядзе касматага і худога коніка. Гэткім быў конскі завод у першыя гады свайго існаваньня.

Сьледам за конікам скачуць і дзіка выгінаюць свае храбты племянныя жарабцы—сучасная ўласнасьць заводу.

Бадзёра ідуць школьнікі першай ступені і піянэрскія атрады. Яны з якімсьці асаблівым захапленьнем крычаць «ура» ў адказ на прывітаньні.

Больш гадзіны цягнецца гэта калёна міма трыбуны, міма шчыльнай сьцяны людзей, якія згрупаваліся на ходніках.

Але вось прайшла апошняя калёна, пратуркатаў апошні аўтамабіль.

Хутчэй на станцыю спатыкаць дарагіх гасьцей—нарвэскую дэлегацыю.

Спатканьне дэлегацыі.

На пляцы каля вакзалу—сьцягі, плякаты, мядзяныя трубы аркестраў, натоўп.

На пэроне—ганароная варта і дэлегацыі ад рабочых, партыйных і іншых арганізацый гораду. Павольна падходзе цягнік і спыняецца. Таварышы Гільд (член ЦК нарвэскай кампартыі) і Мансэн (член ЦК нарвэскага камсамолу) выходзяць з вагону і вітаюцца з вартаю.

Іх зьяўленьне на пляцы спатыкаецца гукамі некалькіх аркестраў.

Тав. Гільд на нямецкай мове вітае сабраўшыхся са сьвятам Кастрычніка і гаворыць, што нарвэская дэлегацыя асабіста пераканалася ў дасягненьнях савецкай улады за гэтыя дзесяць год рэвалюцыі.

Ад імя нарвэскага камсамолу працоўных Гомеля вітае т. Мажэн. Ён гаворыць, што пралетарыят Нарвэгіі заўсёды гатовы ў цяжкую хвіліну аказаць дапамогу савецкай краіне.

На прывітаньні гасьцей адказваюць тав. Гантман, рабочы галоўных майстэрняў Касьцюк і селянка Качалава.

Пад гучныя крыкі „ура“ госьці сядаюць у аўтамабіль і ездуць у сваю падшэфную часьць № кав. дывізіі.

Увечары яны выступалі ў рабочых клюбах Гомеля, дзе таксама іх горача віталі.

Юбілейная выстаўка.

У аўторак 8-га была ўрачыста адчынена юбілейная выстаўка. На ёй былі экспанаты ўсіх прамысловых прадпрыёмстваў, культурных і інш. арганізацый Гомеля.

Выстаўка гэта вельмі навучальна. Вось, напрыклад, у вітрыне выстаўлены абразцы мінэральных багацьцяў акругі. Аказваецца, што ў Гомельшчыне ёсьць у значнай колькасьці і амаль на паверхні зямлі фасфарыт (угнаеньне), мэргель (ужываецца для вырабу цэменту), буры жалязьняк і ўсё неабходнае для існаваньня буйнай гуты: вялікі тарфяны масыў (апал), белы і шэры кварцовы пясок і крэйда. Думка аб такой гуце зараз распрацоўваецца і магчыма, што гэта фабрыка ў хуткім часе будзе пабудавана.

З гэткімі багацьцямі Гомельшчына можа сьмела глядзець у будучыню.

А. Золатаў.

Трактар на Старобінскім балоце (Бабруйшчына).

КАСТРЫЧНІКАВЫЯ ДНІ Ў БАРЫСАВЕ.

Яшчэ 5-га лістапада пад вечар горад з усімі яго фабрыкамі, заводамі, культасьветнымі і іншымі ўстановамі прыняў сьвяточны выгляд. Гірлянды з зелені, лёзунгі, плякаты, дыяграмы,—усё гэта апранула ўвесь горад.

Кожны будынак, кожная культурная ўстанова, кожная фабрыка і завод непасрэдна сваім існаваньнем сьведчаць аб перамозе працоўных над тымі руінамі, якія пакінулі белапольскія банды перад сваім бегствам аж за Варшаву.

Вось чаму на ўрачыстым пленуме гарсавету, на агульных сходах на фабрыках і заводах і, наогул, на прафсаюзных сходах рабочыя, работніцы і іншыя працоўныя ў сваіх выступленьнях яшчэ і яшчэ раз падкрэсьлівалі, што толькі пры савецкіх умовах, толькі пад кіраўніцтвам ленінскай камуністычнай партыі мы змагалі дасягнуць тых вялікіх перамог на фронтах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ў рэспубліцы саветаў, і на руінах Барысава пабудаваць рабочыя гарадкі, адчавіць фабрыкі і шырока разгарнуць сетку культасьветных устаноў.

Дзень 6-га лістапада быў сьведжай, што працоўныя ня спыняюцца на здабытых дасягненьнях, а ідуць да далейшых перамог.

Аб гэтым сьведчыла ўрачыстая закладка вялікага мураванага будынку ў цэнтры рабочага гарадка пад школу сямёхгодку.

— Мы закладаем новы будынак культуры, дзе нашыя дзеці і ўнукі будуць набываць веды, каб хутчэй прысьці да сацыялізму,—кажа **рабочы тав. Бароўка**—член прэзыдыуму ЦВКБ і намесьнік старшыні Барысаўскага гарсавету.

Тыя-ж прамовы з вуснаў рабочых ад варстату можна было чуць на ўрачыстым адчыненьні гарадзкога клюбу, які паясе сьвет у рабочыя масы, замест тэй цемры, якую раней з гэтых сьцен распаўсюджвала сынагога.

За культурай у дзяржаве рабочых і сялян першае месца займае ахова здароўя працоўных.

На гэтым фронце Барысаў таксама рухаецца наперад: 6 лістапада ў прысутнасьці наркома аховы здароўя тав. Барсукова працоўныя Барысава сьвяткавалі адчыненьне вялікай больніцы, 3-х амбуляторый, з якіх дзьве пры фабрыках „Чырвоная Бярэзіна“ і „Дамбаль“. Адбылося таксама ў гэты дзень урачыстае адчыненьне начнога дыспансэра для сухотных хворых.

— Толькі дзякуючы вялікаму Кастрычніку мы адчыняем шэраг новых устаноў, мэта якіх—ахова здароўя працоўных,—казалі рабочыя Барысава на ўрачыстасьцях.

Адчынілася ўдзень 6 лістапада агульнае памяшканьне для бесрацоўных, паложан быў пачатак арганізацыі прыёмніка на 20 дзяцей бяспрытульных.

Дзень 6-га лістапада закончыўся вечарамі па паасобных саюзах і прадпрыёмствах, на якіх адбыліся ўспаміны аб мінулых гадох барацьбы за Кастрычнік, аб часох зьдзекаў польскай буржуазеі над працоўнымі гораду, а разам з тым апошнія ў спэктаклях і канцэртных аддзяленьнях дэманстравалі сваю творчасьць.

7-га лістапада.

— Бачыце, неба і тое ідзе за бальшавікамі,—кажуць, сьмяючыся, навокал.

І сапраўды, надвор'е, як у цёплыя, сьветлыя дні мая—нават у маі не заўсёды бывае так добра...

Прызыўныя гукі фабрычных гудкоў дружна заклікалі працоўных на вуліцы, каб вялікім калектывам у дзень 10-годзьдзя Кастрычніка прадэманстраваць сваю моц і яшчэ раз падвесьці вынікі за гады савецкага будаўніцтва.

Сотні сьцягаў і плякатаў, тысячы і тысячы рабочых, работніц і іншых працоўных арганізаванымі шэрагамі пад гукі бадзёрых маршаў са сьпевамі рэвалюцыйных песень зьбіраліся на вялікі пляц у цэнтры Новабарысава.

Тут-жа разам з працоўнымі выстрайваюцца часьці адзінай у сьвеце Чырвонай арміі.

Здаецца, ніколі яшчэ гэты пляц ня бачыў гэтулькі народу; і яно зразумела—працоўныя сьвяткуюць дзесяцёхгодзьдзе існаваньня сваёй дзяржавы...

Адчыняецца мітынг,..

Першае слова—памяці барацьбітом, палажыўшым сваё жыцьцё за справу рабочае клясы...

Музыка грае жалобныя маршы, схіляюцца сьцягі і галовы рабочых.

Паліліся прамовы радасьці, бадзёрасьці, прамовы закліку да далейшай барацьбы за ўсясьветны Кастрычнік.

-- Няхай нашыя дасягненьні зьявяцца заклікам да пралетарыяту ўсяго сьвету, каб ён па нашаму прыкладу зьвярнуў шыю буржуазеі і ўтварыў з намі адзіны ўсясьветны Саюз Савецкіх Рэспублік,—заўляюць рабочыя ў сваіх прамовах.

— Недалёка гэты час, калі рабочыя ўсяго сьвету пах

Кастрычнік на Заходнім фронце.

У часе Кастрычнікавага перавароту я быў у Менску. Гэты горад тады знаходзіўся на адлегласьці 100-150 кілёмэтраў ад лініі фронту.

У ім было згуртавана ўсё прыфронтавае жыцьцё: тут знаходзіўся штаб армії Заходняга фронту, і горад меў выгляд зусім ваеннага характару.

Прыблізна за 1-1½ месяцаў да перавароту ў Менску адбыліся перавыбары «Савету Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў». Дзякуючы, галоўным чынам, салдатам менскага гарнізону і вайсковым часьцям, якія знаходзіліся ў горадзе, большасьць новага Савету была бальшавіцкая. Старшынёю яго быў абраны т. Ляндэр, стары бальшавік. Новаму Савету прышлося змагацца з меншавіцка-эсэраўскай уладай, прадстаўніком якой на ўвесь заходні фронт быў Жданаў, камісар ураду Керанскага. Заменакоены вынікамі выбараў у Савет і настроем рабочых і салдат, Жданаў, пры дапамозе старога вайсковага апарату, распачаў кампанію рэпрасій проці бальшавікоў.

Мы выдалі тады газэту «Звезда». Афіцэрскія атрады Жданава зачынілі нашу газэту і апячаталі друкарню. Нам прышлося яе друкаваць у іншай друкарні, пад іншай назвай. Ня менш 10 разоў у працягу месяца Жданаў і яго прыхільнікі зачынялі нашую газэту, але яна ўсё-ж не пераставала выходзіць, не зважаючы на арышты супрацоўнікаў. Нарэшце, калі газэта і друкарня былі разгромлены ў дзесяты прыблізна раз, мы пастанавілі перайсьці да «актыўнае абароны». На паседжэньні Савету была ўхвалена рэзалюцыя пратэсту проці зачыненьня газэты і адначасова прадстаўнік нашае фракцыі заявіў, што „з заўтрашняга дня памяшканьне рэдакцыі і друкарні будзе ахоўвацца ўзброеным атрадам рабочых і салдат добраахвотнікаў". Атрад узброеных таварышоў і сапраўды ахоўваў па другі дзень нашу «Звезду». Камісар часовага ураду пакінуў нашу газэту ў спакоі.

Ён зараз заняўся „чысткай" арміі: сотнямі арыштоўваліся салдаты, што адмаўляліся ісьці ў наступ і выконваць загады контр-рэвалюцыйных афіцэраў. На фронце разбураліся цэлыя палкі, і к моманту перавароту ў Менску знаходзілася каля 6 тысяч арыштаваных салдатаў-„бальшавікоў". Яны размяшчаліся ў асобым лягеры, на адлегласьці 3 вёрст ад гораду. Некалькі сот «бальшавікоў»-афіцэраў было пасаджана ў вайсковую турму.

Гэтыя арыштаваныя таварышы стваралі першыя рэвалюцыйныя кадры ў часе перавароту. Калі з Піцеру і Масквы прышлі першыя весткі аб перавароце, Жданаў і яго «рэвалюцыйны» камітэт ня ведалі, што ім рабіць. Мы скарысталі гэта і запатрабавалі ад яго вызваленьня ўсіх арыштаваных. Жданаў адмовіўся. Але яго «разрашэньня» ніхто і не чакаў. Арыштаваныя «вызваліліся» самі, пры чым ахоўваючыя іх «верныя Часоваму Ураду» салдаты ня толькі не рабілі ім ніякіх перашкод, але разам з імі зьявіліся да дому Савету і аддалі сябе ў яго распараджэньне. Такім чынам, у нас быў кадр.

Зараз-жа трэба было высьветліць, на якія вайсковыя часьці мы можам разьлічваць. Усе адказныя таварышы—члены Савету накіраваліся ў палкі. І ўжо за другі дзень было ясна, што ў Жданава і яго «рэвалюцыйнага» камітэту ня было ніякіх сіл, што ўвесь горад у нашых руках.

Мне было запрапанавана высьветліць настрой салдат, працуючых на Менскай радыё-тэлефоннай станцыі. Справа ў тым, што весткі з Масквы і Петраграду паступалі неакуратна, бо тэлеграфныя і чыгуначныя зносіны былі зусім перарваны. Адзіным «вакном у Расею» ў гэткіх умовах быў радыё-тэлеграф.

Станцыя знаходзілася на акраіне гораду, і я з двума таварышамі адправіўся туды на аўтамабілі.

На станцыі нас спаткаў нейкі стары штабс-капітан. Я заявіў яму, што мяне паслаў Менскі Савет, каб упэўніцца навочна, ці працуе станцыя. Капітан сур'ёзна заявіў, што ў памяшканьне ён нікога ня можа пусьціць. Я ўжо дунаў паказаць свой мандат, але ў гэты час падышоў другі афіцэр—паручык. Ён пагаварыў з капітанам, які потым нам заявіў, што на станцыі мы можам рабіць «усё, што захочам», і што ён, капітан «старой службы», здымае з сябе ўсякую адказнасьць за ўсе злачынствы, і што ён, капітан, ня мае нічога проці, каб мы паслалі па радыё-тэлеграфу тэлеграмы нават і Леніну або імпэратару Вільгельму?

Заявіўшы гэта, капітан зьбіраўся пайсьці, але потым, падумаўшы, прасіў даставіць яго на нашым аўтамабілі ў горад. Адзін з таварышоў-салдат паехаў разам з ім у горад, а я з другімі таварышамі пайшоў у пакой радыё-тэлеграфістаў.

Тут нас спаткалі больш прыхільна. Але, перш за ўсё, салдаты перагледзелі нашыя мандаты, намацаўшы нават пальцамі пячатку. Пераканаўшыся, што ўсё ў парадку, яны заявілі нам, што ўсе яны бальшавікі. «Ёсьць у нас некалькі эс-эраў і белых—але яны не працуюць, кінулі апараты і пашлі.

А афіцэрства?

Зусім ня ўмешваецца. Памоцнік начальніка і дзяжурны афіцер яшчэ ўчора пайшлі ў горад. Начальнік гаворыць, што яму ўсё роўна. Ён у нас, урэшце, п'яніца...

А радыё хто прымае?

Вось з гэтым—бяда. Усяго нас, умеючых прымаць, двое. Тав. А. сядзіць пры апараце ўжо амаль суткі... Другі адпачывае. Скажэце ў Савеце, каб прыслалі зьмену.

Я пазнаёміўся з т. А. Ён—маладзенькі, вясёлы хлапец. Страшна змарыўся. На вушах у яго апарат. Паказвае нам апошняе радыё з «Царскага сяла» (Петраград)—там ужо перамога рэвалюцыі поўная. Масква ўжо некалькі гадзін нічога не дае. Відаць, не працуе станцыя. Станцыя у Магілеве (там у той час была стаўка галоўкамандуючага) пытаецца ўвесь час, што робіцца ў Піцеры. «Я адказаў—гаворыць А.,—што ў Петраградзе і ў Маскве—улада Саветаў. Ня верыць!»

Я сядзеў на станцыі ўсю ноч. Апарат працаваў бязупынна, паступалі ўсё новыя і новыя весткі. Раніцой атрымалі першую адозву Петраградзкага Савету.

* * *

Праз дзень уся ўлада была ўжо ў руках Саветаў. Жданаў і яго эсэраўска-меншавіцкі камітэт выпусьціў нейкую адозву «аб бясспрэчным падпарадкаваньні часоваму ўраду», члены якога ў Петраградзе былі ўжо арыштаваны. Але гэта было „апошняе слова": эсэраўска-меншавіцкая кампанія, за выключэньне Жданава, пасьпеўшага ўцячы, была ўжо арыштавана і дастаўлена ў будынак Савету.

Вялікі будынак штабу знаходзіўся ў цэнтры гораду. З прычыны таго, што начальнік штабу і галоўнакамандуючы фронтам генэрал Дзянікін адхіліў прапанову Савету аб «мірных перамовах і дабраахвотнай здачы», нам прышлося задумацца аб узяцьці штабу штурмам. Невядома адкуль зьявіліся два браніраваныя аўтамабілі і артылерыя. Штурмам павінен быў кіраваць т. Мясьнікоў, ранейшы прапаршчык запасу, стары член бальшавіцкай партыі. Але ў апошні момант штурм зьявіўся непатрэбным. Пасьля невялікай, перастрэлкі, якая ня выклікала ніякіх чалавечых ахвяр, штаб здаўся. Галоўнакамандуючым часова быў назначаны т. Каменшчыкаў, ранейшы падпалкоўнік царскай арміі, член Савету і бальшавік.

* * *

У «штурмс» штабу мне ня прышлося прымаць непасрэднага ўдзелу, бо ў гэты час я быў заняты другой справай: прэзыдыум Савету назначыў мяне начальнікам атраду па барацьбе з бандытамі. Бандытызм у гэты час дайшоў да страшэнных размераў.

Савет пастанавіў змагацца з бандытамі са ўсёй рашучасьцю. Каля 200 узброеных салдат заўсёды былі «напагатове» ў памяшканьні Савету. Калі дзе-небудзь у горадзе ці за горадам пачыналі рабаваць, мы на двух грузавіках выяжджалі туды. Звычайна мы не пасьпявалі захапіць бандытаў, бо прыяжджалі вельмі позна. Але ў некалькіх выпадках нам удалося перашкодзіць бандытам і затрымаць іх.

В. Панскі (Сольскі).

А К Т

урачыстай закладкі будынкаў Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту (Унівэрсытэцкага Гарадка).

У выкананьне пастановы 3-й Сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік у лютым месяцы 1927 году, VIII Зьезду Саветаў Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў Беларускае Савецкае Сацыялістычнае Рэспублікі і пастаноў Савету Народных Камісараў Беларускае Савецкае Сацыялістычнае Рэспублікі ад 6-га сьнежня 1924 году,



Праэкт галоўнага будынку Унівэрсытэту.

26-га мая 1926 году і 3-га кастрычніка 1927 году ў дзень Вялікага Сьвята 10-цігодзьдзя Кастрычнікавай Рэвалюцыі закладаецца 1-ы будынак Беларускага Унівэрсытэцкага Гарадка—Галоўны яго Аўдыторны Корпус.

Нахай набудова Беларускага Унівэрсытэцкага Гарадка зьявіцца помнікам культурнага росту Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, выкліканага Вялікім Кастрычнікам.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **А. Чарвякоў.**

Старшыня Савету Народных Камісараў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **М. Галадзед.**

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **А. Хацкевіч.**

Народны Камісар Асьветы Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **А. Баліцкі.**

Старшыня Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту і Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў **С. Яцкевіч.**

Рэктар Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту **Ў. Пічэта.**

Сябры Праўленьня Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту **С. Слонім, Я. Клыс.**

Беларускія грамадзкія арганізацыі, лічачы пабудову Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту вынікам напружанай працы рабочых і працоўнага сялянства на шляху сацыялістычнага будаўніцтва, вітаюць пабудову Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту, зьвязаную з дзесяцігодзьдзем Вялікага Кастрычніка.

Нахай Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт, заложаны пад сьцягам Кастрычніка, асьвеціць сьветам Сацыялістычнай Культуры ўсю Беларусь, нахай ён будзе вечнавечным помнікам напружанай і ўпартай волі пралетарыяту і працоўнага сялянства, на кіраванай моцнай, як граніт, і цьвёрдай, як сталь, Камуністычнай Партыяй.

Генэральны Сэкратар Цэнтральнага Камітэту Камуністычнай Партыі (бальшавікоў) Беларусі **В. Кнорын.**

Старшыня Цэнтральнага Савету Прафэсыянальных Саюзаў Беларусі **Перапечка.**

Сэкратар Ленінскага Камуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі **А. Баранькікаў.**

6-га лістапада 1927 году
г. Менск.

Рабселькоры—дзеці Кастрычніка.

Вялікі Кастрычнік адкінуў існаваўшы да рэвалюцыі погляд, што праца па выданьню газэты і часопісі зьяўляецца справай выключна толькі «спэцыялістаў».

Наша газэта спусьцілася да шырокіх працоўных мас і знайшла сярод іх шмат здольных, сьвядомых і адданых ёй працоўнікоў.

У выданьні нашых газэт і часопісяў чынны ўдзел прымае сама маса.

Уладзімір Ільліч больш 20 гадоў таму назад з далёкай эміграцыі ў сваім лісьце пісаў:

«Давайте пошире рабочим возможность писать в нашу газету, писать або всем решительно, писать как можно больше о будничной своей жизни, интересах и работе».

Гэты ленінскі завет нашай партыяй, нашым партыйна-савецкім друкам выконваецца не на словах, а на справе.

Арганізацыя рабочых і вясковых карэспандэнтаў расьце з кожным днём і актыўна працуе ў напрамку ўзмацненьня эканамічнага і культурнага становішча краіны саветаў.

Згодна вестак апошняга падліку, мы бачым, што рабселькораўская арганізацыя Беларусі ў сваіх шэрагах мае 4.500 чалавек, з іх рабкораў 35 пр., селькораў 55 пр., іншых 10 проц. Жанчын 5-7 проц., партыйцаў і камсамольцаў 30 проц.

Гэты колькасны рост рабселькораўскай арганізацыі яскрава сьведчыць аб сьвядомым жаданьні рабочай і сялянскай масы прыняць актыўны ўдзел у перамозе тых цяжкасьцяй, у правільным вырашэньні задач, якія стаяць перад камуністычнай партыяй, савецкай уладай і ўсімі працоўнымі нашай краіны.

Толькі гэтым тлумачыцца сучасны грамадзкі рост рабселькораўскага руху ў нас на Беларусі і ва ўсім Саюзе ССР.

Побач з гэтым колькасным ростам рабселькораў расьце лік селькораўскіх і рабкораўскіх гурткоў і насьценгазэт.

Значэньне-ж рабселькораўскай арганізацыі і яе працы надзвычайна вялікае.

Кожны дзень на працягу 10-годзьдзя рабселькоры на канкрэтных прыкладах жыцьця і працы сялянства і рабочых высьвятлялі наша сапраўднае становішча, нашы дасягненьні і перашкоды ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве як у горадзе, так і ў вёсцы.

Праз дзесяткі і сотні лепшых, перадавых прадстаўнікоў рабоча-сялянскай масы—рабселькораў—савецкая ўлада і камуністычная партыя цесна зьвязана з жыцьцём і працай шырокіх колаў працоўных савецкай дзяржавы.

Недарма рабселькораўская арганізацыя, якая знаходзіцца ў самым шчыльным датычэньні з усімі галінамі штодзённага палітычнага жыцьця і эканамічнага будаўніцтва краіны, прызнана камуністычнай партыяй **«адным з форм рабоча-сялянскай грамадзкасьці».**

Адсюль зразумела тая вялікая і сур'ёзная ўважлівасьць, з якой партыя, партыйна-савецкі друк адносяцца да ўсіх дасягненьняў і недахватаў рабселькораўскага руху.

Якія-ж дасягненьні да 10-годзьдзя Кастрычніка мае рабселькораўская арганізацыя Беларусі?

Гэтыя дасягненьні заключаюцца ў наступным:

1. Узрост колькаснага складу рабкораў і селькораў. Гэты рост у сярэднім адпавядае лічбам, якія маюцца ў іншых частках СССР.

2. Палепшылася якасьць рабкораўскіх і селькораўскіх допісаў.

3. Значнае ўзмацненьне кіраўніцтва партыі рабселькораўскім рухам, аб чым сьведчаць праведзеныя за 1926 г. у большасьці округ раённыя і акруговыя нарады рабселькораў (гэткіх-ж нарады праводзяцца і ў гэтым годзе).

4. Палепшаньне кіраўніцтва з боку рэдакцый цэнтральных і акруговых газэт рабселькораўскай працай (нарады рабкораў, мэтадычныя ўказаньні, індывідуальныя лісты, куткі рабселькораў).

5. Узмацненьне палітыка-выхаваўчай працы ў гуртках і палепшаньне якасьці насьценгазэт як па зьместу, так і па форме.

6) Палепшаньне ўзаемаадносін рабселькораў з кіраўнікамі адміністрацыйных і гаспадарчых устаноў і г. д.

Зразумела, што побач з гэтымі дасягненьнямі мы можам наглядаць выпадкі і адваротнага характару. Выправіць усе памылкі і недахваты, якія яшчэ маюцца,—зьяўляецца чарговай задачай рабселькораўскай арганізацыі.

Бясспрэчна, што дасягненьні, якія мы маем к 10-годзьдзю Кастрычніка, не павінны спыняць тэмпу нашай працы.

Пераходзячы ў 11 гадавіну існаваньня краіны Саветаў, рабселькораўская арганізацыя Беларусі з яшчэ большай энэргіяй возьмецца за выкананьне сваіх задач.

Разам з партыяй, пад яе кіраўніцтвам рабселькоры—гэтыя сапраўдныя дзеці вялікага Кастрычніка—будуць працаваць над ажыцьцяўленьнем чарговых задач камуністычнай партыі і нашай улады.

Над разрытай магілай.

(Памяці беларускіх паўстанцаў, загінуўшых у бойцы з палякамі пад г. Пружанамі ў 1920 г.).

Ужо мінула 7 год з таго часу, як недалёка ад г. Пружан, Горадзенскай губэрні, адбылася заўзятая бойка паміж беларускімі паўстанцамі і адступаўшымі польскімі войскамі. Ніхто пра гэтую бойку нідзе ня пісаў, ніхто не расказваў пра тых гэрояў, якія, ратуючы ад польскіх акупантаў сваю радзіму, адвечную частку Беларусі, не пашкадавалі свайго жыцьця—загінулі за лепшую долю беларускіх сялян і рабочых.

Асабліва-ж хочацца ўспомніць пра гэты слаўны эпізод барацьбы Заходняе Беларусі за вызваленьне ад польскіх панаў у час, калі вы рыхтуецеся спаткаць 10-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка, які прынёс вам сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне, а мы паранейшаму стогнем у няволі . . .

. . . . . .

. . . . . .

Польскае войска пад націскам Чырвонай арміі бяжыць у беспарадку. Весткі маланкаю разьлятаюцца сярод сялянства аб магутным наступе Чырвонай арміі на Варшаву.—Чырвоныя ў Косаве... Чырвоныя ўзялі Картуз-Бярозу... Сёньня або заўтра возьмуць Пружаны... Гэтыя чуткі выклікалі ў насельніцтве энтузіязм і вялікую радасьць. Моладзь, якнайбольш энэргічная, пачала думаць аб актыўным выступленьні проці ўцякаючага панства. Калі стала вядома, што Картуз-Бярозва (16 вёрст ад Пружан) ужо знаходзіцца ў руках чырвоных, вясковая моладзь, як па камандзе, дастала схаванае (яшчэ ад нямецкай акупацыі) ужо заіржавелае аружжа і ноччу па адным, каб не зьвярнуць на сябе ўвагі, пачала зьбірацца на ўмоўленым загадзя месцы (на краю лесу ля Пружанаў, на скрыжаваньні галоўных шляхоў: шасэ ў напрамку на Варшаву, Бялавежа-Бельск і вялікі шлях у напрамку Камянец-Літоўскі).

Яшчэ да раньняй зоркі была ў поўнай гатоўнасьці значная група маладых бунтароў, узброеных нямецкімі карабінамі. Рассыпаўшыся ў ланцуг, з вялікай непярпліваськю пачалі чакаць ворага. Нядоўга ім прышлося чакаць. Хутка данесла паўстанчая разьведка, што па шасэ ў напрамку на Шарашова рухаюцца дзьве кампаніі (роты) польскае пяхоты. Паўстанцы замярлі... Толькі зрэдка чуецца сільны голас камандзіра паўстанцаў, Аляксандра Чэрняка, які даваў распараджэньне, каб ніхто з паўстанцаў ня сьмеў страляць, пакуль вораг ня будзе на блізкай адлегласьці.

«Толькі добра страляць, хлопцы»!—пачуўся той самы голас: «Каб ні адна куля не прапала дарма. А галоўнае — не баяцца. Мусім адным залпам палажыць некалькі дзесяткаў гэтых пазнанскіх сабак, бо інакш будзе дрэнна».

Ціха... Чаканьне... Вось ужо відаць двое афіцэраў на сытых чорных конях наперадзе. Едуць, апусьціўшы галавы.

Яшчэ некалькі хвілін чаканьня і ўжо ясна чуваць польская гаворка.

Раптам—тр-р-а-а-х! На хвілінку ўсё сьціхла... Толькі крыкі параненых палякаў давалі знаць паўстанцам, што іх залп вельмі ўдалы.

Пасьля раз за разам — тр-р-а-а-х! Тр-р-а-а-х!..

У радох ворага сумятоха і беспарадак, тым болей, што гэта было—як гром з яснага неба... Пачалося адступленьне. Але гэта было толькі момант, бо палякі, апамятаўшыся, што, адступаючы, яны палезуць на штыхі Чырвонай арміі, пачалі ўпарадкаваць рады сваіх разбегшыхся жаўнераў і рыхтавацца да адпору. Паўстанцы, заўважыўшы гэта, пачалі таксама, з свайго боку, рыхтавацца да рашучай схваткі... Доўга чакаць ня прышлося. Польскае войска, рассыпаўшыся ланцугом, пачало наступаць на лес, дзе заселі паўстанцы. Паднялася страшная стрэляніна... Ня гледзячы на тое, што палякі адкрылі гураганны кулямётны агонь па нашай пазіцыі, паўстанцы трымаліся моцна. Доўга цягнулася стрэляніна: атакаваць паўстанцаў вораг не асьмельваўся.

Тым часам у паўстанцаў пачаў выходзіць запас набояў — няма чым страляць... Апроч таго, страцілі некалькі таварышоў і ў тым ліку свайго сьмелага камандзіра, што вельмі дрэнна адбілася на паўстанцкіх радох. Вораг-жа не драмаў: чым далей, тым бліжэй падыходзіў, ахопліваючы паўстанцаў кальцом...

Паставаў вельмі крытычны момант для паўстанцаў...

Было толькі два выхады—або прабіваецца праз варожыя рады, або разьбягацца па лесе, хто куды. Апошні выхад, па думцы паўстанцаў, быў асабліва няўдалы, бо вораг мог бы без вялікіх перашкод перастраляць усіх. Заставаўся толькі першы выхад, тым болей, што паўстанцы заўважылі ў радох ворага нейкую трывогу.

Гэтым момантам паўстанцы рашылі скарыстацца і ўжо намерваліся ажыцьцёвіць свой плян, як раптам з-за карчоў, засопшыся, выбеглі два хлапчукі «курэры» з весткай, што атрады Чырвонай арміі ўжо захапілі вёску Куплін (3 вярсты ад Пружанаў), значыць, вось-вось зьявяцца і ў Пружанах. Вестка, прынесеная «курэрамі», нагэтулькі падняла настрой паўстанцаў, што яны, сабраўшы ўсе свае сілы, кінуліся на ворага, які пачаў адступаць у напрамку на Шорашова, відаць, каб ня быць адрэзанымі Чырвонай арміяй ад шляху адступленьня. З прычыны таго, што запас набояў у паўстанцаў амаль зусім вычэрпаўся, вораг без асаблівых страт мог адступаць, пакінуўшы сваіх забітых і параненых.

Прасьледваньне ворага было бескарыснае, а таму паўстанцы вярнуліся на месца бойкі, каб забраць з сабою забітых таварышоў і перанесьці іх у Пружаны.

Тым часам Пружаны былі ўжо зусім ачышчаны ад палякаў, і, такім чынам, паўстанцы, забраўшы сваіх забітых і параненых, свабодна маглі ўвайсьці ў горад.

. . . . . .

. . . . . .

Весткі маланкаю разьнесьліся па вакольчых вёсках аб адбыўшыхся падзеях, і ў хуткім часе ў Пружаны зьявілася вельмі шмат сялянства, каб пабачыць сваімі ўласнымі вачыма тых, што так заўзята бароліся з панскім войскам, тым болей, што ніхто ня ведаў дакладна, хто і адкуль гэтыя байцы. Кожны з трывогай у душы пасьпяшаў да Пружан, думаючы замест чужога ўбачыць свайго сына, брата, сваяка, бо ўсе былі рады біцца з палякамі.

З в. Дабучына таксама прыйшлі людзі. Сярод іх асабліва выдзяляўся высокі, з белымі як сьнег валасамі. дзядуля, які ў кампаніі з маладзіцаю прыйшоў сюды. Ён меў аднаго сына, адзіную апору на старасьці. Яму было добра вядома, што яго сын вызначаўся бунтарскім характарам і ў апошні час вельмі часта пачаў зьнікаць з дому. Бацька сварыўся, угаварваў, але сын гэтага ня слухаў. У апошні вечар, калі яго Аляксандар пачаў хутка кудысь зьбірацца, бацька несьцярпеў і стаў прасіць застацца дома, памінаючы пра неспакой, які ўсюды запанаваў. Але Аляксандар і на гэты раз не паслухаў... Пакінуў старых бацькоў (бацьку болей як 80 год), маладую жонку, гаспадарку і пайшоў, каб ужо ніколі назад не вярнуцца...

Трывога дзядулі Чэрняка і яго нявесткі ня была памылковай. У Пружанах, на галоўным пляцы, уквечаныя і пакрытыя чырвонымі сьцягамі стаялі тры дамавіны, і адна з іх была дамавінай яго аднасенькага сына Аляксандра...

Каб ушанаваць памяць загінуўшых, іх пахавалі на галоўным пляцы Пружан.

Але нядоўга прышлося ім адпачываць на гэтым месцы. Прыйшлі зноў польскія крумкачы, разрылі паўстанцкія магілкі, а косьці гэрояў выкінулі за места, каб такім чынам помсьціцца хоць над мёртвымі «хамамі», што асьмеліліся паўстаць супроць панаў...

. . . . . .

. . . . . .

Сьпіце спакойна, дарагія таварышы! Прыдзе час (магчыма, ён ужо не за гарамі), калі над вашай разрытай, асьмеянай магілай пранясецца вольная магутная песьня вольных працоўных Заходняе Беларусі...

М. НАВІЦКАЎ.

Пружаны.
4-IV-27-г.

Агонь.

На гонях дальніх,
ў палёх прасторах,
чырвонай кветкай
зацьвіў агонь.
Мы поўны сілы—
ня чуем зморы;
бадзёра й жвава
бяжыць наш конь.

Мінаем вецьце
кустоў калючых,
пакуту—трэблю,
балота—твань.
Нам стрэчны вецер
пяе, што скора
сусьвет агорне
зарніца—рань.

Глядзім наперад:
зарой пунсовай
там паланее
наш аганёк.

Мы ўдаль нясёмся
к прасторам новым,
і з кожнай хвіляй
шпарчэй наш крок.

Мы марна ў полі
сіл не разьвеем:
яны патрэбны
краіне й нам.
З падзеяй пэўнай,
з магутнай верай
імчымся к сьветлым
мы берагам.

Мы радасьць—соладзь
п'ём без астатку,
журбу былую
зарылі ў жвір.
Наш сьцяг буяе,
бы цьвецень мая,
нас вабіць рухам
жыцьцёвы вір...

Я. ІВАШЫН.

Па чатырох краінах.

(Уражаньні і сапраўднасьць).

Бэрлін.

А сёмай гадзіне мы ў Бэрліне. Цягнік спыняецца па вагромністым Сілезкім вакзале. Нас абдае магутны шолам гарадзкога жыцьця. Вакола яно кіпіць, як вар, бушуе, гудзе. Усьцяж доўгіх, як вокам зьмерыць, вуліц, снуюць нязьлічаныя таксі, храфтаўтобусы, трамвай. Зіхаціць палатно асфальту—адбіваючы агні, як у вадзе.

Прасякнутае перагараўшым бэнзынам паветра ўрываецца ў вокны вагону, пралазіць у нутро. Асаблівае, спэцыфічнае паветра Бэрліну—яно спатыкае вас далёка ад гораду.—Бэнзын і сыгарны дым. Апошнім прапахшы ўсе нямецкія вагоны, кафэ, харчоўні, вуліцы. Ад яго не схавацца і ў дачных мясцовасьцях... Але да гэтага паветру ты скора прывыкаеш, як прывыкаеш да надзвычайнае чыстасьці і адмысловай яквуратнасьці бэрлінскага жыцьця... Яно ўжо мне знаёма па ранейшаму бываньню ў Бэрліне. Ня нова гэта жыцьцё і для М. Чарота. І мы, цікавячыся прыгожым выглядам вячэрняга гораду, сачым, як рэагуе на яго наш М. Зарэцкі. Вось ён выскачыў з вагону і стаў на плятформе, каб разглядзець вакзал. Дзясяткі плятформаў абапал яго несьціханна прапускаюць цягнікі. Колькі іх! Прыбываюць, адбываюць літаральна кожную хвіліну. Адно і чуш гучны лопат паравозных каміноў. Як утрапёная, сходзіць і ўходзіць у вагоны публіка. Але таўхатні — ніякай. Ніхто і нішто нікому не мяшае. Аўтаматычна вылазяць на плятформу тыя, каму трэба ехаць, і гэтак жа аўтаматычна спускаюцца ўжо другімі ўсходамі тыя, што прыехалі. Паўсёдашнія надпісы паказваюць вам усе хады і выхады, усе патрэбныя вам мясьціны. Толькі ведай латынскі альфабэт і патрэбныя ў абыходзе словы, як ужо не саб'ешся і не заблудзіш. Пытаць табе нічога ня трэба—чытай надпісы і будзеш ведаць: куды ідзе цягнік, калі ён ідзе, з якое плятформы ў яго садзіцца і інш. М. Зарэцкі пільна азірае вакзал, дзівіцца, пацепае плячыма. Мы бачым, што ён знаходзіцца пад вялікім уражаньнем. Ды хто вольны ад яго, прыяжджаючы ўпяршыню ў Бэрлін? Каго ня можа захапіць шалёная дынаміка яго руху, гаману, жыцьця? Гэта спатыкаеш ты пры самым уезьдзе ў горад, тады, калі ў тваім ваччу заклышацца вагромны прамень сьвятла, павісшага над Бэрлінам, а ў вушну засьвідруе яго трапяткі шолам...

Бэрлін яшчэ шумнейшы днём—у час разгару дзелавога жыцьця. Мы ж прыехалі вечарам, калі гэты шум ціхае, а нановерх выступаюць іншыя вобразы гораду. Адчыняюцца бязлікія кабарэ, танцёкалі, вінштубы і бірштубы, кіно ды тэатры. Горад убіраецца ў багатае аддзеньне рознаколернай электрычнасьці. Цэнтральныя вуліцы і плошчы разубіраюцца да адказу сьветавою рэклямаю. Яна мігаецца над кафэ, над магазынамі, над рэстаранамі, над кіно. Заве, завабляе рухаючымі надпісамі, сылуэтамі фігур... Але, гэта далей. Мы накуль яшчэ, на Сілезкім вакзале. Чамусьці, цягнік засталяўся. Час паказвае на спазьненьне. А восьмай мы павінны быць на Фрыдрыхштрасе вакзале, а тым часам, нам яшчэ праехаць некалькі вакзалаў. Ніўжо нам надказалі неправідловы тэрмін прыезду? У кожным разе, як бы там ні было, а хочацца скарэй вылезьці з цягніку, асталявацца на кватэры і тады прыняцца за агляд гораду, за спатканьні, наведы, вывучэньне...

А восьмай з хвілінамі мы на Фрыдрыхштрасе вакзале. Злазім і накіроўваем да выйсьця. Глядзім у бакі, ці ня сустрэне нас карэспандэнт «Савецкае Беларусі», якога мы паведамілі тэлеграфна аб сваім прыезьдзе. Як быццам бы яго ня відаць. Няўжо не атрымаў нашае тэлеграмы? Аднак сумненьні разсяюцца—калі пры выхадзе ў горад нас аклікае знаёмы голас таварыша М. Вітаемся. М. паведамляе аб прыездзе ў Бэрлін т. т. Прышчэпава, Г. Гарэцкага і інш. Апошнія нас шукалі па дадзеных ім адрасох. Маюцца праз дзень схаць у Данію. Мы задаволены—сустрэнемся з таварышамі... Спатканьне на чужыне з блізкімі людзьмі—прыемная рэч.

У адчуваньні гэтага мы сходзім у ніжні атаж вакзалу, мяняем грошы і едзем у пансыён, дзе т. М. загадзя заказаў нам пакоі. На дарозе разважаем—ці адпачываць, ці пайсьці ў горад, ахаяўшыся ад дарогі... За адпачынак—ніводнага голасу. Дзе там! Ці-ж можна згубіць цэлы вечар без агляду гораду! М. Зарэцкі жадае адведаць нямецкага піва, М. Чарот многа разоў успамінаў знатныя каўбаскі Ашынгера. Не адкладаць жа гэтага на заўтра! Ды ноч, ды нагода—аж люба! На наша шчасьце—нагода справодзіць нас нязьменна. І хоць па многім яна перашкаджае выпаўненьню нашых заданьняў, асабліва ў справе спатканьня з намечанымі намі людзьмі, але дае мажлівасьць пабываць у садох, у сквэрах, за гарадам, поўнасьцю выкарыстаць яго агляд...

А дзесятай з паловай мы шнуруем чысьцюткімі, бліскучымі вуліцамі сусьветнага гораду. Куды накіраваць? Што ўпяршыню аглядзець? Я прапаную зрабіць рэйс па падземнай дарозе ў Заходнюю частку гораду. Трэба М. Зарэцкаму паказаць падземку... Згаджаюцца ўсе і, ня гледзячы на ўтому, мы праяжджаем досі значны кавалак гораду. Выходзім на шумнейшай вуліцы, каб аглядзець яе пачную панараму. Вуліца ўся ў электрычным асьвятленьні. Газэтчыкі выгукваюць навіны з начных выданьняў газэт. Гэтыя-ж навіны падносяцца ваччу з-пад даху дому ў бягучай электрычнай лепце... Побач—багатая сьветавая рэкляма дапамінае аб інтэрнацыянальным варэтэ „Скала"... Шмыгаюць аўтабусы, трамваі. Начная публіка запаўняе тратуары; яна ці кудысьці сьпяшыць, ці, наадварот, спыняецца каля вокнаў магазынаў і падоўгу разглядае выстаўлены ў іх тавар... На нейкі час мы пераймаем агульныя навыкі, але патроху стамляемся і едзем дамоў, каб на заўтра днём прадаўжыць пачатае—агляд гораду

Кожны раз, калі ты прыяжджаеш ў Бэрлін хоць праз кароткі час, ты бачыш многія навіны ў справе паляпшэньня гарадзкое гаспадаркі, урэгуляваньня руху, павялічэньня й без таго вялікае яго чыстасьці. У гэтых адносінах Бэрлін займае адно з першых мейсц. Ён надзвычайна хутка расьце. Зараз у Бэрліне налічваецца чатыры міліёны дзьвесьці тысячаў з лішнім жыхарства. Бэрлін наганяе Парыж па колькасьці свайго насельніцтва. А па ўмеркаваньню ўнутрыгарадзкога жыцьця ён пакінуў Парыж далёка з-заду. Асабліва зьвяртае на сябе ўвагу дасканалае ўрэгуляваньне вулічнага руху. Апошні да таго вырас, што пусьці яго на волю—дык не пералічыш колькасьці ахвяр. Дзеля таго каб абмінуць няшчасьці ад наездаў безьлікіх таксі аўтабусаў, каб ня мець блытаніны і таўхатні пры пераходзе вуліц—на скрыжаваньнях апошніх вывешаны трохсьветавыя ліхтары. Яны паперамешна выблыскваюць на ўсе чатыры канцы, спыняючы чырвоным агнём. Сотні аўтамабіляў і грамады людзей па адной вуліцы, каб у гэты момант прапусьціць іх па ператочнай і наадварот. Дзякуючы гэтаму, кожны шофэр, кожны кандуктар і кожны прайходжы глядзяць на сыгналы і згодна ім пераяжджаюць і перайходзяць скрыжаваньні вуліц і пляцы.

Тым ня меней—гэта сродак ня ёсьць канчатковым у справе вырашэньня пытаньня руху. Сыгналы, як-ні-як, адбіраюць многа часу пры частых спынках. А ў часы разыходу са службы—на скрыжаваньнях вуліц да таго згрудзяецца народу, што даводзіцца чакаць дужа доўга, каб перайсьці з аднаго боку на другі.

Не здавальняюць у належнай меры патрэбаў перавозкі і тыя рознастойныя багатыя сродкі, якімі Бэрлін валодае. Да крайняй мажлівасьці выкарыстаны час пры пусках цягнікоў на гарадзкой чыгунцы, па падземнай чыгунцы, трамваяў і аўтабусаў. Уцалку яны штодня праводзяць да дзесятку міліёнаў пасажыраў. І, тым ня меней, раніцам, калі ўсе ідуць на працу, і вечарам, калі з працы вяртаюцца—цяжка сваячасова папасьці ў вагон, ці ў трамвай, ці ў аўтабус. Для абмінаньня гэтых цяжкасьцяў—прымаюцца розныя рады: павялічваецца колькасьць

Партыйнае жыцьцё

СЁНЬНЯ АДЧЫНЯЕЦЦА 7 ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ВАЙСКОВАЙ АКРУГІ.

Падрыхтоўка да партканфэрэнцыі прайшла з посьпехам.

Прайшоўшыя дывізыйныя партканфэрэнцыі ў асноўным падагулілі ўсю працу, якую партарганізацыя Беларускай вайсковай акругі правяла ў справе растлумачэньня тых разгалосьляў па ўнутрыпартыйных пытаньнях і ў справе згуртаваньня навакол Цэнтральнага Камітэту нашай партыі вайсковай партыйнай арганізацыі.

У выніку гэтай унутрыпартыйнай працы, партарганізацыя акругі да 7-й партыйнай канфэрэнцыі падышла ідэалёгічна стойкай і спаянай. Апроч гэтага, дывізыйныя канфэрэнцыі паказалі, што за мінулы год партыйная арганізацыя правяла вялікую працу ў справе палітычнага выхаваньня чырвонаармейцаў і ўзмацненьня баявых шэрагаў часьцей Беларускай акругі.

На 7-й партыйнай канфэрэнцыі нам трэба будзе падагуліць у канчатковай форме ўнутрыпартыйнае становішча ў часьцях Чырвонай арміі акругі і падрыхтаваць партыйную арганізацыю да надыходзячага 15 партыйнага зьезду.

З прычыны таго, што акруговая канфэрэнцыя будзе адбывацца ў момант, калі скончана звальненьне старослужачых 1903 году нараджэньня і прышоў у нашы казармы маладняк 1905 году, мы тут зможам падагуліць вынікі баявой падрыхтоўкі палітычнай працы, тыя станоўчыя і адмоўныя бакі, якія выявіліся ў працэсе гэтай работы з тым, каб спаткаць працу з навічкамі-чырвонаармейцамі 1905 году нараджэньня ў моўным узброеньні.

Міжнароднае становішча, якое ўскладнілася, ставіць зараз побач з унутрыпартыйнымі пытаньнямі таксама пытаньне баявой падрыхтоўкі. Аб апошнім у нас будзе спэцыяльны даклад, па якому партыйная канфэрэнцыя зможа вызначыць тыя шляхі, па якіх пойдзе яшчэ большае ўзмацненьне баявой гатоўнасьці нашай акруговай арганізацыі.

Сонкін.

Партканфэрэнцыя Беларускай вайсковай акругі адчыніцца сёньня ў Беларускім Дзяржаўным Тэатры а 6-ай гадз увечары.

* * *

На канфэрэнцыі будзе прысутнічаць каля 300 дэлегатаў з пастаноўчым і дарадчым галасамі.

На канфэрэнцыю прыяжджае Нам. Старшыні Рэвваенсавету СССР тав. Уншліхт, які зробіць даклад аб міжнародным становішчы і задачах абароны краіны.

Унутрыпарт. дэмакратыя і актыўнасьць.

(Акцябрскі райён, Менск).

У сваёй працы Райком КП(б)Б абапіраўся на шырокі пласт актыву, якога налічваюць да 225 чалавек. Усе асноўныя пастановы партыі, пытаньні практычнае працы РК і ячэек спачатку абмяркоўваліся і прапрацоўваліся на нарадах актыву. Райком, апрача таго, уцягваў у практычную працу актыў, шляхам выдзяленьня камісій па вывучэньні і абсьледваньні працы розных ячэек. Гэта праца ўцягвала новыя пласты актыву ў практычную працу.

Вось, прыкладна, важнейшыя пытаньні, якія абмяркоўваліся на актыве: аб масавай працы па пастановах сакавікоўскага пленуму ЦК КПБ, аб рацыяналізацыі вытворчасьці, пастановы ЦК УсеКП(б), аб працы савецкіх ячэек, аб перавыбарах бюро ячэек гарсавету, фабзавмясцкомаў і інш.

Прапрацоўка пытаньняў на актыве знаёміла яго з пастановамі партыі, і тут-жа вызначаўся парадак практычнага ажыцьцяўленьня іх ва ўмовах райёну

Апрача таго, значная частка актыву прымае ўдзел у райённых пленумах РК (сэкратары, апоргі і інш.).

Апошнія перавыбары і вопыт мінулых даказвае аб растучай актыўнасьці і зацікаўленасьці да працы з боку партыйцаў. Некалькі прыкладаў. У частцы ячэек па справаздачных дакладах бюро ячэек выказалася ад 30 да 60 проц. складу ячэек, у некаторых з-за вялікае колькасьці запісаўшыхся ў спрэчках справаздачы пераносіліся на другі раз. Даклад па пытаньню аб абутку скуранога трэсту заняў два партыйныя дні. Абойны—праца вытворчых нарад—таксама два сходы.

Спрэчкі маюць дзелавы характар, і кожны падае практычныя прапановы па палепшаньню працы.

Выбар кандыдатур у бюро ячэек уважліва абмяркоўваўся, і да кожнага падыходзілі асобна, выбіралі лепшых. Характэрна тое, што ў таварышоў у часе перавыбараў выявілася пэўнае жаданьне быць абранымі ў бюро ячэек. Рост актыўнасьці ў арганізацыі зьяўляецца вынікам працы па правільнаму разгортваньню ўнутрыпартыйнае дэмакратыі. Гэта зьяўляецца простым доказам няправільнасьці, дэмагогіі апазіцыі аб партыйным «зажыме».

Арганізацыя пытаньне ўнутрыпартыйнае дэмакратыі ўяўвіла добра. Арганізацыя цалкам проці фракцыйнасьці і дэмагогіі, а за шырокае абмеркаваньне важнейшых пытаньняў працы і пастаноў партыі ў мэтах больш пасьпяховага іх правядзеньня ў жыцьцё.

В. Капаевіч.

Праца камсамолу сярод вучнёўства.

(Случчына).

У гэтым годзе райгарком камсамолу зьвярнуў сваю ўвагу і на працу сярод вучнёўства, дзякуючы таму, што ў мінулым годзе было некаторае паслабленьне працы вучнёўскіх органаў, як напрыклад, вучкомаў і іншых самаарганізацый, за кошт фармальнай вучобы. Дзякуючы гэтаму, з пачатку вучэбнага году ва ўсе школы гораду былі выдзелены правадыры фарпостаў (там, дзе ёсьць піанэры), а ў некаторыя школы—і прадстаўнікі райгаркому. Задачы гэтых прадстаўнікоў зводзяцца к наступнаму: 1) Дапамагаць і навяроўваць працу вучкомаў. 2) Наладзіць працу піанэрскага фарпосту, які павінен мець уплыў на вучняў і г. д. Але трэба адзначыць, што піанэрскія фарпосты працуюць слаба, за некаторымі выключэньнямі.

Праца арцеляў наладжвалася: санітарная арцель вядзе ў школе санітарную працу па ўнядрэньню санітарных навыкаў у быт вучняў, гледзіць за санітарным становішчам школы і г. д. Культурна-палітычная арцель вядзе працу па сваёй галіне. Школьныя саветы ў кожную арцель вылучаюць свайго прадстаўніка, які дапамагае працы арцеляў і г. д.

Дзеля лепшага ўплыву на вучнёўскую моладзь з боку камсамолу, райгарком прымацаваў усе школы гораду да ячэйкі ЛКСМБ працасьветы, галоўная задача якой зводзіцца к працы сярод вучнёўства.

На сходах ячэйкі, ставяцца пытаньні аб працы вучкому тэй ці іншай школы, пытаньні стала абгаварваюцца і выносяцца практычныя прапановы ў напрамку палепшаньня школьнае працы. Таксама ячэйкай, пры дапамозе райкому, адчыняюцца палітычныя гурткі. Гэтыя гурткі будуць займацца чыткай і распрацоўкай газэтных матар'ялаў. Кіраўнікі ў гэтыя гурткі ўжо вылучаны па лініі райгаркому камсамолу.

Па школах была праведзена праца растлумачэньня сутнасьці пазыкі індустрыялізацыі. І вучні пастанавілі: сабраць з кожнага па некалькі капеек і купіць частку аблігацыі ці аблігацыю, якую аддадуць у фонд барацьбы з бясспрытульнасьцю. Такім чынам, кожны вучань, даючы некалькі капеек, адчувае сябе ўдзельнікам сацыялістычнага будаўніцтва.

П. Шт—ў.

Удзел парт'ячэйкі ў рацыяналізацыі апарату.

(Ячэйка КПБ, Менскага ЦРК).

Рацыяналізацыя апарату будзе мець поўны посьпех тады, калі на дапамогу прыдуць шырокія колы працоўных, з непасрэдным удзелам парт'ячэек. Цяпер паглядзім, як ячэйка МЦРК выконвае дэрыктывы кампартыі ў гэтай галіне.

Менскі ЦРК налічвае 80 прадпрыемстваў (магазынаў, крамаў, з колькасьцю 520 служачых, з якіх 100 партыйцаў. Як відаць, працы даволі і ёсьць з кім яе праводзіць.

Перад тым, як прыступіць да самой рацыяналізацыі, на агульных сходах партыйцаў і служачых было зроблена растлумачэньне гэтага пытаньня, пасьля чаго ячэйка практычна падыйшла да рацыяналізацыі апарату. У выніку маецца спрашчэньне пісаніны ў вучоце на 30 проц. і скарачэньне 6 штатных адзінак у праўленьні, што дае эканоміі ў год на суму 6520 рублёў, і яшчэ будзе скарочана 4 адзінкі.

За летні час ячэйка заслухала 2 даклады камуністаў—кіруючых той ці іншай галінай ў каапэрацыі, аб тым, як яны праводзяць рацыяналізацыю. Было высьветлена, што партыйцы ня зусім добра зразумелі сэнс самой рацыяналізацыі і рэжыму эканоміі. Напрыклад, камуніст-загадчык магазыну № 13 рабіў эканомію за кошт скарачэньня санітарных выдаткаў, бо ў гэтым магазыне заўсёды купляюць сяляне, для якіх санітарыя не патрэбна, сляніну сёньня можна і ня захаваць у паперу—гэтак гаварыў камуніст-загадчык крамы. Другі камуніст, загадчык крамы, лічыў, што рацыяналізацыю праводзіць павінен ён адзін, бяз удзелу служачых. Гэткія моманты трэба зьнішчыць, і лепш уявіць усёй ячэйцы баявую задачу партыі адносна рацыяналізацыі.

Бюро ячэйкі кожны месяц склікае нарады камуністаў, працуючых у ЦРК, па пытаньнях практычнага правядзеньня рацыяналізацыі. Нарады даюць добрыя вынікі. Напрыклад, па ініцыятыве нарады ў адным магазыне рыхтуецца пераход на экспедыцыйную працу (г. зн. паставіць тэхніку водпуску тавараў з эўрапейскай хуткасьцю.)

Партыя вядзе барацьбу з пратэкцыянізмам, а некаторыя партыйцы ЦРК самі дапамагаюць пратэкцыянізму. Гэткія выпадкі былі. Бюро ячэйкі каго трэба працягнула да адказнасьці, адміністрацыяй ЦРК зволена 15 асоб прынятых праз пратэкцыянізм. Апрача гэтага, у апараце яшчэ застаецца каля 100 асоб—сваякоў. Бюро ячэйкі і РСІ трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на апарат ЦРК.

Пытаньні рэжыму эканоміі прапрацованы добра, было пастаўлена на сходах служачых каля 40 дакладаў. Потым ячэйка вакол сабе арганізавала каапэрацыйны актыў, які дапамагае праводзіць рацыяналізацыю апарату, рэжым эканоміі і іншыя мерапрыемствы партыі.

Янка Зб.

Га [illegible] № 2468.

Чым багата наша Беларусь.

(На выстаўцы Белдзяржгандлю).

З прычыны дзесяцігодзьдзя Кастрычніка, Белдзяржгандаль наладзіў выстаўку экспортна-імпортных тавараў.

Выстаўка прыцягнула ўвагу шырокіх пластоў сялянства і рабочых.

Неабходна падкрэсьліць, што выстаўка робіць прыгожае ўражаньне і дае яскравы адбітак нашых экспортна-імпортных тавараў; асабліва добрае ўражаньне робіць экспорт, які падрабязна выяўлены.

— Вось у гэткім выглядзе мы атрымліваем шчаціну,—паказвае заг. экспортам групцы сялян,—брудная, з рознаю прымешкаю, а вось у гэткім выглядзе пасылаем заграніцу,—паказвае прыгожа апрацованы пучок шчаціны.

— Ай, ай, што-ж гэта такое, няўжо-ж гэта ад нашых сьвіней?—пытаюцца сяляне.

— Так, так, ад беларускіх сьвіней гэткі волас.

А на другой сьцяне ў парадку разьвешаны ўсе віды і гатункі беларускае пушніны, пачынаючы з вавёркі і канчаючы выдрай і куніцай.

Чырвонаармейцы і сяляне з асаблівою цікавасьцю прыглядаюцца да ўсіх зьвяроў; дзяжурны на выстаўцы дае тлумачэньні.

— А гэта беленькае, што гэта такое?

— Гэта—гарпастай; у часы рэакцыі толькі царыца мела права насіць гэткі мех,—растлумачвае дзяжурны.

Рогат навакола.

— А, вось яны нашыя лісіцы, якіх мы прадавалі—гавораць сяляне,—і іх на выстаўку?

— А ці шмат іх вы накіроўваеце і куды?

— Усю гэтую пушніну накіроўваем да немцаў і ў іншыя краіны.

Вялікую зацікаўленасьць выклікае аддзел валакна. Сяляне глядзяць, цікавяцца, распытваюць.

Усю сьцяну займае валакно. Студэнты і студэнткі з асаблівою ўвагаю прыглядаюцца да гэтага аддзелу і запісваюць свае ўражаньні.

Каля аддзелу ануч і касьцей шмат народу.

— Няўжо гэтыя ануч, гэтыя гнілыя вяроўкі даюць што-небудзь, няўжо імі цікавяцца заграніцай.

— Памятайце словы Леніна: «Вяровачка ў гаспадарцы прыгадзіцца»,—вось гэтыя мудрыя словы і збыліся. На вёсках і мястэчках зьбіраюць гэтыя ануч, і мыюць некалькі разоў, аддаём нашым папяровым фабрыкам, а рэшту пасылаем заграніцу.

Шмат хто з сялян прыглядаецца да лектраў, цікавяцца, на што яны ідуць, што з імі робяць, як іх зьбіраюць.

Вялікую зацікаўленасьць выклікае аддзел новых другарадных відаў экспорту: капуста, агуркі, яйкі, гусі, яблыкі, мёд, ганчарныя вырабы, салёныя агуркі, ракі і г. д.

— Вось да чаго мы дайшлі: французы і немцы нашу капусту шамаюць!—гавораць са зьдзіўленьнем адзін чырвонаармеец.

— А вось заразз мы пакажам, што мы атрымліваем ад немцаў замест ракаў і гусей, вось глядзеце.

Перад даведнікамі—машыны для прамысловасьці, для разьвіцьця і спрашчэньня нашае прадукцыі.

Усе з увагаю слухаюць тлумачэньне, для якой мэты ідуць нашыя машыны, што прывозяць з Нямеччыны, Англіі, Даніі, Францыі і іншых краін.

З самае раніцы да позьняга вечара народ ідзе і ідзе на выстаўку; усе хочуць убачыць тую «гнілую вяровачку», якая нам прыносіць машыны.

Л. Манін.

Хроніка.

ПАМЯТАЕМ ГІСТАРЫЧНАЕ МЕСЦА.

На месцы пасяджэньня 1-га рэвкома ў 1917 г. (Ленінградзкая № 6), дзе зараз знаходзіцца Цэнтральны Дом Селяніна, у часе сьвята была прыбіта мармуровая дашка, з надпісам на ўсіх 4-х мовах пад гэткаю назвою: „1917—1927 г."

У гэтым доме знаходзіўся Савет Рабочых Дэпутатаў, Менскі Бальшавіцкі Камітэт і Ваенна-Рэвалюцыйны Камітэт у Кастрычнікавыя дні „1917 г."

ВЯЛІКАЯ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЬЦЬ ВЫСТАЎКАМІ.

Адчыненыя ў Цэнтральным Доме Селяніна выстаўкі — прамысловую, наладжаную ВСНГБ, і сельска-гаспадарчую, наладжаную аграпамічнай і балотнай станцыямі, наведваюць шмат рабочых і сялян. Апошнія надта цікавяцца экспанатамі, якія наглядна паказваюць нам рост за 10 год як у галіне прамысловасьці, так і сельскай гаспадаркі. У сувязі з гэтым выстаўкі будуць адчынены 3 тыдні.

ЗООЛЁГІЧНЫ МУЗЭЙ.

На гэтых днях у Доме Дзяржаўнага Музэю адчыніўся зоолёгічны музэй ІЬК.

Піанэрская дэманстрацыя.

8-га лістапада ў Менску адбылася шматтысячная піанэрская дэманстрацыя, у якой бралі ўдзел усе піанэрскія арганізацыі і вучні школ.

Экскурсіі працоўных у Музэй Рэвалюцыі.

У часе сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя Вялікага Кастрычніка Музэй Рэвалюцыі наведалі шмат масавых экскурсій працоўных Менску. Між, іншым Музэй рэвалюцыі наведалі маскоўскія госьці—удзельнікі Кастрычнікавага перавароту ў Беларусі.

Дасягненьні Кастрычніка.

Па гарадох Беларусі працуе 32 дзіцячых ясьляў, а па вёсках—175; у вёсках існуе 27 дзіцячых кансультацый. Усе гэтыя ўстановы зьяўляюцца дасягненьнямі Кастрычнікавай рэвалюцыі за гады мірнага будаўніцтва.

«Новая і старая вёска».

Каб паказаць, што дала вёсцы Кастрычнікавая рэвалюцыя, саюз працаямі і лесу ў дні сьвята наладзіў карнавал, на якім былі прадстаўлены „старая і новая вёска" з 3 выстаўкамі-перасоўкамі і 9-цю трактарамі.

Карнавал прыцягнуў масу народу.

БЕЛАРУСКАЕ МАСТАЦТВА Ў МАСКВЕ.

Учора выехаў у Маскву для ўдзелу ў вечарох нацыянальнага мастацтва Беларускі Дзяржаўны хор. У Маскву таксама выяжджаюць некалькі цымбалістаў.

КОНКУРС НА ЗДАРОВАЕ ДЗІЦЯ.

У Менску праводзіўся конкурс на здаровае дзіця. У конкурсе прымалі ўдзел 65 дзяцей. Атрымалі прэміі 22 дзіцяй.

ВЕЧАР СПАЙКІ.

8-га лістапада ў Дзяржаўным тэатры адбыўся вечар спайкі рабочых і сялян. На вечары выступаў з прамовай генэральны сэкратар ЦК КПБ т. Кнорын.

Барацьба з жыльлёвым голадам.

Зараз у Беларусі налічваецца 90 жыльлёва-будаўнічых каапэрацыйных т-ваў, куды ўваходзіць 4,000 сяброў, якія ўкладылі ўласных сродкаў у новае будаўніцтва да 300,000 руб. Агульны кошт усіх будаўнічых прац, праведзеных будаўнічай каапэрацыяй, дасягае 5,500,000 руб.

14,775 сялян прапушчана праз Цэн. Дом Селяніна.

З чэрвеня 1926 г. да 1 кастрычніка 1927 г. праз Цэнтральны Дом Селяніна прапушчана 14,775 сялян, якія прыяжджалі ў Менск па розных справах вясельных, судовых і інш.

Каапэраваньне беднаты.

Па даных на 1-га верасьня г. г., разьмер выдзеленых фондаў візавой сеткай сельсаюзу і таварыствамі сельска-гаспадарчага крэдыту складае 40,600 руб., за лік якіх каапэравана звыш 15,000 бядняцкіх гаспадарак.

10,547,000 руб. было адпушчана ў 1926-27 г. на ахову здароўя.

Бюджэт на ахову здароўя ў БССР з кожным годам расьце. Так, у 1924-25 апэрацыйным годзе на ахову здароўя было адпушчана—5,528,000 руб., а ў 1926-27 годзе — 10,547,000 руб.; на 1927-28 бюджэтны год мае быць адпушчана 11,267,000 руб.

Вынікі праверкі беларусізацыі на МБВ чыгунцы.

Прайшло праверку па ўстановах Менскага вузла МБВ чыгункі 292 чалавекі, з якіх ведаюць мову добра 10 чал., здавальняюча—31 чал., недавальняюча і слаба 248, а рэшта зусім ня ведаюць.

39.000 руб. на брукаваньне вуліц.

Аддзел камунальнай гаспадаркі ў гэтым гаспадарчым годзе асигнаваў 39.000 руб. на брукаваньне трактаў і вуліц

Рост саматужна-прамысловай каапэрацыі ў БССР.

Да 10-цігодзьдзя Кастрычніка Беларускі Саматужна - Прамысловы Саюз налічваў 215 арцеляў з лікам сяброў 3,278 чал., 76 назычкова-ашчадных т-ваў з 19,759 пайшчыкамі і ў акруговых саматужна-прамысловых саюзаў.

КЛЯЙМЕНЬНЕ ЗАЛАТЫХ І СРЭБНЫХ ВЫРАБАЎ МЭТРЫЧНЫМІ КЛЯЙМАМІ.

Прабірны Нагляд НКФ БССР атрымаў з Мазэтнага Дваро першую партыю мэтрычных кляймаў. У сувязі з гэтым новавырабаныя рэчы з золата і срэбра будуць кляймідца па мэтрычнай сыстэме.

Лічбы пробы ў мэтрычных кляймах—трохзначныя. Новыя пробы адпавядаюць старым расейскім пробам, а ўласна: для залатых вырабаў—583, 750 і 958 (замест 56, 72 і 92) і для срэбных—800, 875 і 916 (замест 76, 84 і 88). Апроч таго, эмблема кляйма—жаночая галоўка ў какошніку заменена галавой рабочага з молатам.

МЕНСК КАНАЛІЗУЕЦЦА.

НЯМІГА ЗАСПАКОЕНА.

Кожны менскі жыхар ведае пра тыя беды, якія часта рабіла Няміга, на від нікчэмная рэчка. У часе навальніцы вада падымалася высока пад паверхняй зямлі і залівала крамы, скляпы і кватэры, прыносячы штогодна вялізарныя страты.



Бэтоннае кола, вагаю каля 2500 кілёграмаў, блёнамі апускаецца у катлаван.

Усе нячыстоты з абапальных райёнаў сьцякалі ў Німігу па паверхні зямлі, забруджваючы зямлю і паветра. Няміга была рассадніцам заразы.

Цяпер Няміга заспакоена. Ад самага ўваходу ў Менск Няміга ўведзена ў бэтонны астрог, з якога вызваляецца пры ўваходзе ў р. Сьвіслач. Праца па ўключэньні Німігі ў жалеза-бэтонны калектар ад р. Сьвіслачы да Рэспубліканскай вуліцы была закончана яшчэ летась. Сёлета робіцца далейшая закладка бэтонных труб і да канца будаўнічага сэзону будзе скончана.

Вучастак, каналізаваны летась, сёлета забрукован, і Няміга ў часе навальніцы рагоча пад зямлёю.

Усе нячыстоты, якія ўліваліся раней у Німігу па вямлі, сёлета сьцякаюць у яе пад зямлёю і ня брудзяць паветра, не распадсюджваюць заразы.

КАНАЛІЗАЦЫЯ ГОРАДУ.

Даўно ўжо гаварылася і пісалася аб каналізацыі г. Менску. Сёньня гэтае пытаньне стала рэальнасьцю: **Менск—каналізуецца.**

За кароткі час у гэтай справе зроблена шмат. Вуліцы: Энгельса, Камуністычная, Савецкая, Урыцкага і шэраг іншых—амаль каналізаваны.

Прыбыло шмат каналізацыйных матар'ялаў, ганчарных і бэтонных труб. Праца кіпіць, ня глядзячы на дрэннае падвор'е.

С. Аз.

Нарада па пчалярству.

Аддзел сельскае гаспадаркі нар. ком. земляробства склікае на 14 гэтага лістапада нараду інструктарска-тэхнічнага персаналу па пчалярству, з удзелам прадстаўнікоў зацікаўленых цэнтральных устаноў і мясцовых культурных пчаляроў, для разгляду цэлага шэрагу арганізацыйных пытаньняў па пчалярству.

У ліку гэтых пытаньняў, між іншым, бясьць пытаньне аб павялічэньні інструктарска-тэхнічнай дапамогі насельніцтву, разьвіцьця сеткі вучэбна-паказальных пасек, дастаўка пчалярам вульляў і інш.

Пытаньні аб павялічэньні інструктарска-тэхнічнае дапамогі насельніцтву і аб стандартызацыі вульляў для Беларусі мае найважнейшае значэньне. Пустае заданьне: даць пчалярам Беларусі найлепшай канструкцыі і танны рамачны вулей, бо вульлі зараз каштуюць 12—15 руб., што не па кішэні большасьці пчаляроў.

СУД.

ЯК ЗЯНЕВІЧ НЕ ХАЦЕЎ ЖАНІЦЦА.

У Менскім акруговым судзе разгледжана справа Ігната Зяневіча і малалетняга Паўла Гаўрылевіча. Суд прыгаварыў першага на 9 год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і пазбаўленьнем правоў на 3 гады, а другога—на 8 год. Прыняўшы пад увагу недарослясьць Гаўрылевіча, суд знайшоў магчымым скараціць яму тэрмін зьняволеньня да 5 год і 4 м-цаў з пазбаўленьнем правоў на 1 год.

Злачынства іх наступнае:

Галена Бандарык—бядняцка. Яна ня мела іншага спосабу да жыцьця, як найсьці ў савецкую гаспадарку Рым (Капыльскі р., б. Слуцкай акр.) і нанята там надзённічцай. На сталую службу яя прымалі. Яе швагер Кубрак быў у гэтай гаспадарцы кладаўшчыком і намог ёй атрымаць надзённую працу.

Працаваць было цяжка; праца аплачвалася дрэнна, але другога выхаду ня было.

Галена была прыгожая дзяўчына і да яе пачаў заляцацца Ігнат Зяневіч. Праз некаторы час Галена стала цяжарнаю, прычым яна запрапанавала Зяневічу хутчэй жаніцца. А Зяневіч адказвае:

— Я—з прыемнасьцю, але ведаеш сама, што нам цяпер нельга жаніцца.

— Чаму?

— Таму, што я паеду вучыцца. Ажаніўшыся вучыцца будзе цяжка. Ведаеш, Галена, калі мы пажэнімся?

— Калі?

— Калі скончу вучэньне, праз тры гады.

— А як будзе з...?

— Чым?

— Як будзе з дзіцём?

— Трэба, каб ты зрабіла аборт.

— Не, на гэта я ніколі не згаджуся.

Гэтыя словы Галены былі сказаны цьвёрда, і Зяневіч пераканаўся, што аборту яна ня зробіць.

З гэтага моманту Зяневіч пачаў рыхтаваць свой плян. Падмовіўшы хлапца Паўла Гаўрылевіча, ён даў яму абрэз ад вінтоўкі, а сам з Галенаю ў умоўлены час і на ўмоўленае месца выйшаў на спацыр.

Пайшоў дождж, і Галена не захацела быць у парку—пайшла дамоў. Плян Зяневіча ня ўдаўся.

На другі дзень—14 чэрвеня—Зяневіч наўтарыў тое самае: найшоў у парк і сеў на лаўцы. Зяневіч абняў Галену. У гэты час ад плоту выбухнуў выстрал, і Галена ўпала няжывая. Куля параніла ў руку і Зяневіча. Апошні прабакаў апраўдваецца тым, што замах быў і на яго, але следзтва з поўнай бясспрэчнасьцю ўстанавіла віноўнасьць Зяневіча і яго супольніка Гаўрылевіча.

С. Азерскі.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

ВЫНІКІ СПРЭЧКІ ЗА СЕНАЖАЦЬ.

30 ліпеня г.г. коні грамадзяніна вёскі Вострава, Смалявіцкага району, Івана Вярыга, выпадкова ўзышлі на сенажаць Казіміра Баравіка. Паміж Вярыгай і Баравіком распачалася спрэчка, у часе якой Вярыга так моцна ўдарыў калом Баравіка, што той адразу памёр.

Менскі акруговы суд прыгаварыў Івана Вярыгу на пяць год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і пазбаўленьнем у правох на два гады па адбыцьці кары.

ЗА КРАДЗЕЖ.

У ноч на 22 ліпеня г.г. Нічыпар Седукоў, залезшы ў каапэрацыйную краму Менскага Цэрабкопу, пакраў там папяросы, кансэрвы і іншыя тавары.

Менскі акруговы суд прыгаварыў Нічыпара Седукова на тры гады зьняволеньня, але, прымаючы пад увагу малазначасьць вынікаў злачынства, скарацію пакараньне да аднаго году.

Апавяшчэньні.

— Сёньня а 7 гадзіне ўвечары ў Доме Працаўнікоў Асьветы адбудзецца зачынены сход ячэйкі КП(б)Б працасьветы.

На павестцы: дыскусыйнае абгаварэньне гаспадарчых пытаньняў.

ПЭДГАБІНЭТ.

Сёньня а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца сход фізыка-матэматычнага гуртка.

Парадак дня:

Даклад тав. Посаха на тэму „Элемэнты трыгонометрыі ў працы 7-хгодкі".

ПАСТАНОВЫ і ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Савету Народных Камісараў Беларускае Савецкае Сацыялістычнае Рэспублікі

аб правядзеньні ў 1927-1928 навучальным годзе школьнага перапісу.

На падставе пастановы Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Саюзу ССР за 10 жніўня 1927 г. «Аб учыненьні ў 1927-1928 годзе ўсесаюзнага школьнага перапісу» (З. З. ССР 1927 г. № 47, арт. 476), Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Крытычны дзень школьнага перапісу ў БССР устанавіць 15-га сьнежня 1927 г.

2. Правядзеньне школьнага перапісу ў БССР ускласьці на Цэнтральную Статыстычную Ўправу БССР і на падпарадкаваныя ёй органы на мясцох.

3. Перапіс павінен ахапіць усе школы агульнай і спэцыяльнай асьветы, незалежна ад таго, якімі ведамствамі і арганізацыямі гэтыя школы ўтрымоўваюцца.

Увага. Правядзеньне школьнага перапісу ў школах Народнага Камісарыяту Ваенных Спраў, а таксама ў школах, падпарадкаваных Народнаму Камісарыяту Шляхаў, ускладаецца на апараты гэтых ведамстваў па ўзгадненьні Цэнтральнае Статыстычнае Ўправы БССР з паважаванымі Народных Камісарыятаў Ваенных Спраў і Шляхаў пры СНК БССР па належнасьці.

4. Даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы БССР прыцягнуць да правядзеньня школьнага перапісу інспэктараў мясцовых органаў асьветы ў якасьці інструктарскага персаналу. Запаўненьне статыстычных фармуляраў ускласьці на школьных працаўнікоў пад асабовую адказнасьць загадчыкаў школ.

5. Даручыць Цэнтральнай Статыстычнай Управе БССР разам з Народным Камісарыятам Асьветы БССР распрацаваць арганізацыйны плян школьнага перапісу.

6. Усе ведамствы і арганізацыі павінны дапамагаць органам Цэнтральнае Статыстычнае Ўправы ў правядзеньні школьнага перапісу.

7. Для дапамогі насьляховаму правядзеньню школьнага перапісу ўтварыць пры Цэнтральнай Статыстычнай Управе БССР камісію, у якую павінны ўвайсьці адказныя прадстаўнікі ведамстваў і арганізацый, зацікаўленых ў правядзеньні школьнага перапісу. Старшыню камісіі назначыць кіраўніка Цэнтральнае Статыстычнае Ўправы БССР.

8. Даручыць Цэнтральнай Статыстычнай Ўправе БССР выдаць інструкцыю аб ужываньні гэтае пастановы.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Кіраўнік Сраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **М. Мароз.**

10 кастрычніка 1927 году.
г. Менск.

ПАСТАНОВА

Савету Народных Камісараў Беларускае ССР

аб зьняцьці з т. т. Гнілякевіча, М. П. і Лысаева, С. Г., абавязкаў членаў калегіі Народнага Камісарыяту Земляробства і аб назначэньні Вайтэнкі, Ц. К., і Дубіны, А. В., членамі калегіі Народнага Камісарыяту Земляробства.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Зьняць з т. т. Гнілякевіча, Міхала Паўлавіча і Лысаева, Сяргея Грыгорэвіча, абавязкі членаў Калегіі Народнага Камісарыяту Земляробства.

2. Назначыць т. Вайтэнку, Ціта Канстантынавіча і Дубіну, Антона Васільевіча, членамі Калегіі Народнага Камісарыяту Земляробства.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М Галадзед.**

Кіраўнік Сраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **М. Мароз.**

10 кастрычніка 1927 г.
Менск.

ПАСТАНОВА

Савету Народных Камісараў Беларускае ССР

аб дапаўненьні п. „в" арт. 5 пастановы СНК БССР за 11 лютага 1924 г. „аб судовых зборах па справах, якія падсудны зямельным камісіям".

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе даповніць арт. 5 пастановы СНК БССР за 11 лютага 1924 году „аб судовых зборах па справах, якія падсудны зямельным камісіям" (З. З. БССР 1924 г. № 2, арт. 20) п. „в" наступнага зьместу: «в) Бядняцкія і калектыўныя сельскія гаспадаркі пры спрэчках аб праве карыстаньня зямлёй».

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **М. Карклін.**

Кіраўнік Сраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **М. Мароз.**

20 жніўня 1927 г.
МЕНСК.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Совета Народных Комиссаров Белорусской ССР

о проведении в 1927-28 учебном году школьной переписи.

На основании постановления Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров Союза ССР от 10 августа 1927 года „О проведении в 1927-1928 году всесоюзной школьной переписи" (С. З. СССР 1927 г., № 47, ст. 476) Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Критический день школьной переписи в БССР установить 15 декабря 1927 г.

2. Проведение школьной переписи возложить на Центральное Статистическое Управление БССР и на подведомственные им органы на местах.

3. Перепись должна охватить все школы общего и специального образования, независимо от того, какими ведомствами и организациями эти школы содержатся.

Примечание: Проведение школьной переписи в школах Народного Комиссариата Военных Дел, а также в школах, подведомственных Народному Комиссариату Путей Сообщения, возлагается из аппараты этих ведомств по согласованию Центрального Статистического Управления БССР с уполномоченными Народных Комиссариатов Военных Дел и Путей Сообщения при СНК БССР, по принадлежности.

4. Поручить Народному Комиссариату Просвещения БССР привлечь к проведению школьной переписи инспекторов местных органов просвещения в качестве инструкторского персонала. Заполнение статистических формуляров возложить на школьных работников под личную ответственность заведующих школами.

5. Поручить Центральному Статистическому Управлению БССР вместе с Народным Комиссариатом Просвещения БССР разработать организационный план школьной переписи.

6. Все ведомства и организации должны оказывать содействие органам Центрального Статистического Управления в проведении школьной переписи.

7. Для содействия успешному проведению школьной переписи создать при Центральном Статистическом Управлении БССР комиссию, в каковую должны войти ответственные представители ведомств и организаций, которые заинтересованы в проведении школьной переписи. Председателем комиссии назначить управляющего Центральным Статистическим Управлением.

8. Поручить Центральному Статистическому Управлению БССР издать инструкцию о применении настоящего постановления.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР **Н. Голодед.**
Управляющий Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР **М. Мороз.**
10 октября 1927 года.
г. Минск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Совета Народных Комиссаров Белорусской ССР

об освобождении т. т. Гнилякевича, М. П. и Лысова, С. Г., от обязанностей членов коллегии Народного Комиссариата Земледелия и о назначении Войтенко, Т. К., и Дубины, А. В., членами коллегии Народного Комиссариата Земледелия.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Освободить т. Гнилякевича, Михаила Павловича и Лысова Сергея Григорьевича от обязанностей членов Коллегии Народного Комиссариата Земледелия.

2. Назначить т. т. Войтенко, Тита Константиновича и Дубину, Антона Васильевича членами Коллегии Народного Комиссариата Земледелия.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР **Н. Голодед.**

Управляющий Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР **М. Мороз.**

10 октября 1927 г.
г. Минск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Совета Народных Комиссаров Белорусской ССР

о дополнении пункта „в" ст. 5. постановления СНК БССР за 11 февраля 1924 года „о судебных сборах по делам, подсудным земельным комиссиям".

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет дополнить статью 5 постановления СНК БССР от 11 февраля 1924 года „о судебных сборах по делам